Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 70 к. „ 3 „ — 2 р. — к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародніх — 20 к. мясцовых — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок наіпаралі насьля тэксту — р. 50 к. За радок наіпаралі насьпрад тэксту 1 р. — к. За радок наіпаралі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпецыяльныя на 50 проц. дарожэй. Зьніж тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГО'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 11 (2199) Пятніца, 13-га студзеня 1928 г.

2-ая Сэсія ЦВК БССР VIII скліканьня.

Дзяржаўны бюджэт БССР на 1927-28 год.

Даклад Наркамфіна тав. Мікуліча.

Пасьля падрабязнага дакладу тав. Галадзеда аб нашых дасягненьнях і далейшых задачах у 5-цігадовым разрэзе, мая задача па высьвятленьні бюджэту на 1927-28 г. значна палягчаецца, бо бюджэт на 1927-28 год зьяўляецца адрэзкам таго порыяду, які ўваходзіць у 5-цігадовы плян, аб якім мы ўжо заслухалі шырокі даклад тав. Галадзеда. Пададзены Саветам Народных Камісараў на зацьверджаньне Сэсіі бюджэт на 1927-1928 год мае ў сабе некаторы асаблівасьці, якія адрозьніваюць яго ад бюджэту мінулага году. Да БССР у мінулым годзе далучана Гомельшчына (Гомельская і Рэчыцкая акругі), мы зрабілі ўзбуйненьне часткі райёнаў, галоўным чынам, на Гомельшчыне, зьліквідавалі 4 акруговыя цэнтры, узбуйнілі частку сельсаветаў (у Гомельшчыне) і г. д. Усё гэта дало нам магчымасьць правесьці ўнутранае разьмеркаваньне сродкаў з большым падлікам нашых народна-гаспадарчых патрэбаў з максымальным асыгнавачьнем сродкаў на гэтыя народна-гаспадарчыя патрэбы нашай краіны.

Бюджэт прадстаўляе свод усіх прыбыткаў ад розных галін гаспадаркі і мэтазгоднае, правільнае разьмеркаваньне гэтых даходаў паміж запатрабаваньнямі гэтае гаспадаркі для дасягненьня народна-гаспадарчых мэтаў. Таму характарыстыку трэба пачаць з даходнай яго часткі, з таго фінансавага становішча нашай краіны, у якім мы знаходзімся.

Фінансавае становішча краіны.

Зьвернемся да выкананьня бюджэту у мінулым годзе. Мы маем ужо даныя па выкананьню бюджэту 1926-27 г., праўда, пакуль што папярэднія. Па гэтых даных даходная частка за мінулы год выканана на 99 проц., выдатковая частка на 101 проц. Я кажу, што гэтыя даныя могуць зьмяніцца, бо па прыкладу мінулых гадоў мы можам разлічваць на дастатковае паступленьне ў касы нашага Саюзу, якія затрымаліся пераводам для залічэньня ў наш бюджэт. Але з практыкі мы ведаем, што гэтыя дадатковыя паступленьні ня зьменяць характару нашага бюджэту; яны могуць толькі паленьшыць яго даходную частку, бо выдаткі па бюджэту мінулага году ўжо спынены.

Калі мы зьвернемся да мінулых гадоў, то бачым, што бюджэты нашы рэальна складаюцца, бо яны добра выконваліся, асабліва ў даходных частках нашых уласных тэрытарыяльных даходаў.

Таму, мы можам з упэўненасьцю сказаць, што бюджэт на 1927-28 год з падлікам палітыкі і практыкі мінулых гадоў складзен рэальна ў даходнай частцы.

Трэба спыніцца ў некалькіх словах, як праходзіла выкананьне выдатковай часткі бюджэту ў мінулым годзе, якія адмоўныя моманты мы мелі пры выкананьні бюджэту. Мы мелі выпадкі, праўда, у меншай колькасьці, чым раней, парушэньняў бюджэтнае дысцыпліны, выдаткаваньня сродкаў не па прызначэньню. Асабліва гэта адчувалася на мясцох. Гэта адбылася паміж іншым і ў галіне выдаткаваньня сродкаў па фонду беднаты. Галоўныя парушэньні па выдаткаваньню гэтага фонду—гэта: скарачэньне тэрміну крэдытаваньня, павышаны процант за пазыкі супроць устаноўленага, малыя сумы выдач, дзякуючы чаму гэтыя пазыкі выдаткоўліся немэтазгодна, часам безгаспадарчая бюджэтная Камісія, якая заслухала прадзеную справаздачу аб выкананьні бюджэту мінулага году, адзначыла гэтыя адмоўныя моманты і дала дырэктыву, каб іх у далейшым не паўтараць. Поўных даных аб выдаткаваньні сродкаў не па прызначэньню мы ня можам даць на сёньнешні дзень, бо выдаткаваньне гэтых сродкаў па бюджэту мінулага году часткова праходзіла яшчэ і ў лістападзе новага году. З прычыны гэтага ў нас няма яшчэ поўных даных, але ўжо па папярэдніх даных можна ясна бачыць рэальнасьць бюджэту 1926-27 г. Рост бюджэту адбівае рост усяе народнае гаспадаркі нашай краіны.

Зьмены ў прыбытковай частцы бюджэту.

Я ня буду падрабязна спыняцца на эканамічных прадпасылках па складаньню бюджэту на гэты год, бо гэтая частка пытаньня поўнасьцю вычарпана дакладам тав. Галадзеда, я толькі паўтару некаторыя итогавыя даныя каб суразьмерыць тэмп росту нашага бюджэту з тэмпам росту народнай гаспадаркі. Па кантрольных лічбах, якія складзены на 1927-28 г., рост прадукцыі сельскай гаспадаркі мяркуецца ў 2,8 проц, а прамысловасьці ў 9,3 проц., па пасрэднікаму гандлёваму звароту 10,6 проц. У той-жа самы час мы бачым, што рост нашага бюджэту абганяе рост народнае гаспадаркі, бо бюджэт, які прадстаўлен на зацьверджаньне Сэсіі, выражаецца ў суме 63.147.780 рубл., з ростам супроць мінулага году на 22,8 пр. Калі падлічыць яшчэ выдаткі, якія адносяцца на Саюзны бюджэт і якія ў мінулым годзе праходзілі па рэспубліканскаму бюджэту, як выдаткі па мэліарацыю, а таксама выдатак на будову універсытэту ў Менску, калі гэта дадаць да прыбытковай часткі нашага рэспубліканскага бюджэту, то узрост выдатковай часьці нашага бюджэту вызначыцца ў 30,5 проц. Між тым нашы ўласныя прыбыткі ня толькі не ўзрастаюць, але зьніжаюцца супроць мінулага году на 3,3 пр. Прыбыткі нашы вызначаюцца ў 46.146.340 руб., застаюцца не пакрытымі ўласнымі прыбыткамі 17.100.410 р., якія мы лічым пакрыць за лік адлічэньняў ад гэрбавага збору, які праходзіць па Саюзнаму бюджэту.

Узрост адзінага дзяржаўнага бюджэту Саюзу на 27-28 год мяркуецца каля 18 проц., узрост нашага бюджэту—22,8 пр., такім чынам наш бюджэт апераджае ўзрост адзінага бюджэту Саюзу.

У складзе бюджэту на 27-28 год ёсьць асаблівасьці, якія даюць зьніжэньне прыбытковай часткі. Самая вялікае зьніжэньне дае лясны прыбытак. Лясныя прыбыткі ў нас складаюць каля 47 проц. усёй прыбытковай часткі нашага бюджэту і, зьніжаючыся ў абсалютнай сваёй суме ў бюджэце на 27-28 год, складаюць даволі значны недахоп у прыбытках нашага бюджэту. Зьніжэньне лясного даходу вызначаецца на 2.980.837 р. супроць вызначэньня 26-27 году.

Якія галоўныя прычыны зьніжэньня гэтага самага вялікага даходу ў нашым бюджэце? Усе ведаюць, што мы ўжо некалькі год падрад вырубаем лясы на зямфонду, які перадаецца сялянству ў працоўнае карыстаньне (бяднейшай частцы сялянства), і што вырубка лясоў на зямфонд ужо падыходзіць к канцу, што якасьць дравясіны горшае на зямфондзе, з гэтых прычын у бюджэце 1927-28 г. гэтая частка лясных прыбыткаў значна зьніжаецца, што дае зьніжэньне ў абсалютнай суме лясных даходаў на 12,5 проц.

Акрамя таго, зьніжаюцца прыбыткі ад нашай дзяржаўнай прамысловасьці. Зьніжэньне цэн, якое было ў мінулым годзе, не магло не адбіцца на зьмяншэньні накапленьняў у самой прамысловасьці, на зьмяншэньні прыбыткаў прамысловасьці.

Таксама зьніжаны прыбыткі і ад нашага дзяржаўнага гандлю.

Усё гэта, разам узятае, не кампенсыруецца павялічэньнем астатніх падатковых і непадатковых прыбыткаў, і агульны аб'ём прыбытковай часьці нашага бюджэту на 27-28 год, як ужо раней сказаў, зьніжаецца на 3,3 проц., таму і суадносіны падатковых і непадатковых прыбыткаў, якія адзначаліся ў мінулым годзе пры зацьверджаньні бюджэту, зьмяняюцца. Калі ў мінулым годзе падатковыя прыбыткі ў нашым бюджэце займалі 38,3 проц., то на 27-28 год удзельная вага падатковых прыбыткаў павялічваецца да 43,4 проц. і ў адпаведнасьці з гэтым зьніжаецца ўдзельная вага непадатковых прыбыткаў.

У мінулым годзе яшчэ Сэсія ЦВК давала дырэктыву ўраду аб тым, каб суадносіны падатковых, якія былі ў тым годзе, паміж і непадатковымі прыбыткамі замацаваць і на далейшыя гады і прыняць цэлы шэраг захадаў па павялічэньню асноўнага прыбытковага артыкулу ў нашым бюджэце, гэта значыць аб павялічэньні прыбыткаў ад лясоў.

Мы бачым, што памяншэньне прыбытковасьці ад лесу на 27-28 год пацьвярджае пастаўленую задачу на будучы час, каб за кошт лепшай эксплёатацыі нашай лясной гаспадаркі мы змаглі бы павялічыць у далейшым прыбытковасьць ад нашага лесу.

Сельска-гаспадарчы падатак.

Адным з галоўнейшых артыкулаў, калі не па сваёй удзельнай вазе, дык па свайму эканамічнаму і палітычнаму значэньню—гэта сельгаспадатак, які закранае ўсе сялянскія масы. На гэтым артыкуле трэба больш застанавіцца, каб паказаць, які ўплыў мае сельгаспадатак на нашу сялянскую гаспадарку, таму, што ў вёсцы акрамя сельгаспадатку, іншых падаткаў ніякіх не ўзімаецца, калі ня лічыць, як некаторыя лічаць, што страхавыя ўзносы ўзімаюцца як падатак.

Сельгаспадатак на 27-28 год складае 9200000 рублёў, даючы рост супроць мінулага году на 3,3 проц., а калі ўлічыць дадатковыя асыгнаваньні па маніфэсту, якія прыняты на юбілейнай сэсіі ЦВК СССР, дык гэтая лічба павінна зьнізіцца на 60000 руб. за кошт дадатковых палёгак для бяднейшай часткі насельніцтва; тады ня толькі будзе ўзрост, а зьніжэньне супроць бюджэтных прызначэньняў мінулага году.

Але гэтую суму СНК не зьмяніў,—на 27-28 год—пасьля таго, як былі абвешчаны палёгкі па маніфэсту.

У гэтым годзе да пачатку кастрычніка ўнесена дабраахвотна ў нашы касы каля 300000 руб. планяжоў на адзінаму сельска-гасп. падатку, які дзяржава змагла скарыстаць на патрэбы мінулага году. Мы разьлічваем, што дзякуючы памяншэньню сельгас. падатку, ад пашырэньня палёгак і памяншэньня лясных прыбыткаў на 27-28 год, нам неабходна будзе правесьці растлукачальную працу, каб гэты аванс плацяжоў за кошт сельгас. падатку 27-28 году павялічыць яшчэ да 1 кастрычніка. Гэта дало бы магчымасьць скарыстаць гэтыя грошы ў бягучым бюджэтным годзе. Таму лічба не памяншаецца і ўключае ў сябе

Народны Камісар Фінансаў БССР т. МІКУЛІЧ.

яшчэ суму за кошт авансу адзінага сельг. гас. падатку на 27-28 год.

Ці павялічваецца няжкасьць падатковага абкладаньня? У гэтым годзе, акрамя палёгак па навальніцам аслабонена звыш 35 пр. па с-г. падатку толькі па дэкратных палёгках і па маніфэсту. Да гэтага яшчэ трэба дадаць палёгкі па навальніцы, па градабіцьцю і г. д. якія прадстаўляюцца РВК-мі за кошт скідачных фондаў. Тады, па нашым прыблізным падлікам, будзе каля 40 проц. сялянскіх гаспадарак зволеных зусім ад адзінага сельг. гас. падатку. Цяжкасьць адзінага сельгас. падатку для сялянства не павялічваецца, а памяншаецца. Калі сялянская гаспадарка, як я прыводзіў лічбы, узрастае хоць ціхім тэмпам, дык процант ізьяцьця даходу на сельг. гас. падатках памяншаецца. Калі ў 26-27 годзе процант ізьяцьця складаў 3,49 проц., дык па 27-28 год складае 3,15 проц.—ніжэй супроць працэнта ізьяцьця па Саюзу, яны складаюць 3,45 пр. Бачым, што нашае сялянства слабей абкладаецца, чым у іншых частках Саюзу ССР.

Я ўжо казаў, т. т. што ня гледзячы на тое, што даходная частка нашага бюджэту ў абсалютных сумах надае супроць мінулага году, але, што з вучотам мінулых гадоў яна складзена рэальна, калі, зразумела, не гаварыць аб павялізарным дэфіцыце 17 міл. руб. з ростам на 183,3 проц. У мінулым годзе мы мелі 6 міл. адлічэньняў ад гэрбавога збору, а ў 27-28 г. разьлічана атрымаць 17 міл. р.

Як мы жывем у адносінах да выдаткаў у параўнаньні з іншымі рэспублікамі? Мы трацім на душу насельніцтва на 18-20 проц. менш, чым трацім РСФСР і Украіна.

Калі ў 26-27 г. па БССР на душу насельніцтва выдаткі складалі 14 р. 34 кап., то па РСФСР — 16 р. 88 к., і па Украіне—17 р. 49 к. Так што засталіся мы ззаду ня толькі ў прыбытках з прычыны нашае эканамічнае слабасьці, з прычыны эканамічных асаблівасьцей і гістарычных умоў, у якім мы знаходзіліся і знаходзімся, але і нашыя выдаткі значна менш узрастаюць. Запатрабаваньні ў нас вялізарныя і мы ў адносінах выдаткаў, хаця і груба параўнаўча застаёмся з заду ад братэрскіх рэспублік, загэтым такі дэфіцыт для нас неабходзен дзеля таго, каб падцягвацца здавальняць гаспадарчыя і культурныя запросы нашае краіны.

Выдатковая частка бюджэту.

Пераходзячы да выдатковай часткі нашага бюджэту, неабходна сказаць, пры якіх умовах праэктаваўся бюджэт на 1927-28 год, якія дырэктывы былі дадзены ўрадавымі органамі Саюзу і БССР.

Чаго запатрабавалі гэтыя дырэктывы? (Чытае).

Ці адказвае бюджэт на 1927-28 г. тым дырэктывам, якія даваліся на складаньні бюджэту. Адна з галоўнейшых і важнейшых дырэктыў — гэта індустрыялізацыя краіны, гэты лёзунг партыі і ўлады павінен быць яскрава ў значнай меры адбіт у нашым бюджэце на 1927-28 г.

Калі мы зьвернемся да становішча нашае прамысловасьці, да тых сродкаў, якія бюджэт вылучыў у мінулыя гады і мяркуе даць у 1927-28 г., то ўбачым пацьвярджэньне выкананьня дырэктыў аб усіленьні асыгнаваньня на прамысловасьць, каб ажыцьцявіць лёзунг індустрыялізацыі краіны. Наша прамысловасьць на вытворчасьці ўзрастае і досыць усіленым тэмпам.

Калі ў 1923-24 г. рост вытворчасьці адзначаўся у 30 проц. да папярэдніх гадоў, то ў наступным годзе 55 проц., потым 44 проц., і толькі з 1926-27 г. гэты тэмп некалькі замядляецца—17 з паловаю проц. і ў 1927-28 г.—15,4 проц.

Гэта таксама знаходзіць пацьверджаньне таго, аб чым я ўжо казаў, што тэмп разьвіцьця народнае гаспадаркі замедліўся. Гэтае замядленьне адбіваецца ў вытворчасьці нашай прамысловасьці.

Капітальнае будаўніцтва.

Калі мы ў 1925-26 г. ніякага новага будаўніцтва ў галіне прамысловасьці не рабілі, ці займаліся толькі капітальным рамонтам і частковым пераабсталяваньнем і даабсталяваньнем, дык пачынаючы з 25-26 г. ужо ўкладаюцца значныя сродкі ў новае будаўніцтва.

На капітальным будаўніцтве ў 22-23 г. расходавана 485 тыс. руб., у на[illegible]м гаду—1.321 тыс. р., у 25-26 [illegible]—6.170 тыс. руб., у 26-27 г.—8.[illegible]0 тыс. руб. і на 27-28 г. мяркуецца [illegible]5.465 тыс. руб. Вы бачыце, які [illegible]ок у галіне капітальнага будаўніцтва прамысловасьці, гэта спрыяе таксама і ўзросту асноўнага капіталу.

Тэмп узросту асноўнага капіталу наступны: за 25-26 г. асноўны капітал складаў 26 з лішнім міл. руб. у 26-27—32 міл. р. і на 27-28 г.—41 міл. руб.

Што дае бюджэт прамысловасьці?

Мы бачым, што на 27-28 г. асыгнаваньні па бюджэту на прамысловасьць вызначаюцца ў суме 8.000 тыс. руб., што дае ўзрост на 31,9 проц. Гэта сума пакрывае сабою асыгнаваньні трох папярэдніх гадоў. Пачынаючы з 24-25 г. па 26-27 г. уключна, за тры гады прамысловасьць атрымала ад бюджэту 8.584 тыс. руб. тады, калі на 27-28 г на 1 год прызначаецца некалькі большая сума. З гэтага трэба зрабіць вынікі аб тым, што дырэктыва павялічэньня асыгнаваньняў на прамысловасьць, на капітальнае прамысловае будаўніцтва ў бюджэце на 27-28 г. выканана.

Акрамя сродкаў на прамысловае будаўніцтва, праходзячых па нашаму бюджэту, яшчэ выдзяляюцца асыгнаваньні Саюзным бюджэтам на Асінаўскую электр. станцыю, аб якой гаварылася і на папярэдняй сэсіі. Гэтае будаўніцтва ўжо адбываецца і праходзіць па бюджэту Саюзу. Наш урад пры вырашэньні пытаньня ў Саюзных органах даў абавязак аб удзельнічаньні 30 проц. сваіх сродкаў на будаўніцтва Асінаўскай электр. станцыі. Апрача гэтага нашы мясцовыя гарадзкія электрастанцыі знаходзяцца ў такім становішчы, што яны патрабуюць пераабсталяваньня, палепшаньня і фінансавых затрат.

Асыгнаваньні на

электрыфікацыю

ўзрастаюць супроць мінулага году на 124 проц., складаючы абсалютную суму 1400 тыс. руб.: сюды ўваходзяць 400 тыс. на Асінастрой, а 1 міл. руб. —гэта на мясцовую электрыфікацыю. Паступае пытаньне, на якое мы павінны былі зьвярнуць увагу пры складаньні бюджэту, гэта выдаткі на сельскую гаспадарку. На сельскую гаспадарку прадугледжаны асыгнаваньні ў суме 11420 тыс. руб. з ростам у параўнаньні з мінулым годам на 16,8 проц. Трэба адзначыць, што ў гэтай суме ня ўлічаны выпаткі на мэліарацыю, якія ў мінулым годзе праходзілі па рэспубліканскаму бюджэту, а на 1927-28 год згодна пастановы Сэсіі ЦВК Саюзу аднесены на Саюзны бюджэт. Гэтая сума на водна-мэліарацыйныя работы складае 2391 тыс. Такім чынам, калі прыняць пад увагу і гэтую суму, якая таксама ідзе на сельскую гаспадарку нашай краіны, то ўзрост асыгнаваньняў на нашую сельскую гаспадарку, у параўнаньні з мінулым годам, складзе 41,3 проц., а ў абсалютнай суме —каля 15 млн. руб. Вы бачыце, што сельская гаспадарка толькі па аднаму нашаму дзяржаўнаму бюджэту атрымоўвае значна больш сродкаў, чым бюджэт бярэ ад сельскай гаспадаркі ў якасьці адзінага сельска-гаспадарчага падатку. Я ўжо казаў, што сума адзінага сельска-гаспадарчага падатку з авансам, які мяркуецца на 1928-29 год, складзе 9200 тыс., а па аднаму дзяржаўнаму бюджэту сельская гаспадарка атрымоўвае каля 15 млн.

Галоўнейшыя мерапрыёмствы, якія фінансуе дзяржаўны бюджэт у галіне

сельскай гаспадаркі,

гэта тыя мерапрыёмствы, якія прадугледжаны па 5-гадоваму пляну, аб якіх дакладваў тав. Галадзед,—гэта мэліарацыя, лесаўпарадкаваньне, землеўпарадкаваньне, разьвіцьцё жывёлагадоўлі і інш. Асабліва значны рост мы маем па мэліарацыі і па лесаўпарадкаваньню. Нашыя лясы, як я ўжо казаў, зьяўляюцца галоўнейшай крыніцай нашых прыбыткаў, таму яны, бязумоўна, патрабуюць усё большай увагі да іх, з тым, каб гэтую крыніцу не памяншаць, а ўсё больш узмацняць. Таму на лесаўпарадкаваньне прадугледжана больш сродкаў, дзеля таго, каб хутчэй скончыць лесаўпарадкаваньне і больш рацыянальна ў далейшым весьці эксплёатацыю нашага лесу. Апроч таго, ёсьць яшчэ адна прычына, па якой мы павінны хутчэй закончыць лесаўпарадкаваньне. Справа ў тым, што Дняпрабуд патрабуе значнай колькасьці драўніны, і мы маем дырэктву ад Саюзнага ўраду аб тым, каб у вярхоўях Днепру паскорыць работы па землеўпарадкаваньню, каб можна было там хутчэй перайсьці да нармальнай лесасекі, каб забясьпечыць патрэбы Дняпрабуду. У зьвязку з гэтымі прычынамі, асыгнаваньні на лесаўпарадкаваньні па бюджэту на 1927-28 год прадугледжваюць большую суму, чым гэта меркавалася на гэты адрэзак часу па 5-цігадоваму пляну аднаўленьня сельскай гаспадаркі.

Таксама павялічваюцца ў параўнаньні з мінулым годам выдаткі па

каапэрацыю,

галоўным чынам, на вытворчыя галіны каапэрацыі, зьвязаныя з разьвіцьцём сельскай гаспадаркі, пераапрацоўкай працуктаў сельскай гаспадаркі, і г. д. Рост асыгнаваньняў на гэтую галіну складае 35,4 проц., а ў абсалютнай суме яны складаюць 1.645 тыс. руб., супроць аднаго млн. 215 тыс. руб., якія былі асыгнаваны на ўсе віды каапэрацыі і гандлю ў мінулым годзе.

Сацыяльна-культурныя

выдаткі вырастаюць у бюджэце на 11,4 проц. Пры нашым курсе на больш шпаркае разьвіцьцё прамысловасьці і сельскае гаспадаркі, пры пязначным росьце нашых даходаў, мы, зразумела, ня можам даць большага тэмпу росту сацыяльна-культурных выдаткаў. Сацыяльна-культурныя выдаткі і ў далейшыя гады павінны расьці ў меру ўзросту нашага бюджэту, а ў гэтым годзе, як вы ведаеце, даходная частка нашага бюджэту ня толькі не вырастае, але нават паніжаецца, і, зразумела, што мы ня можам, за кошт павялічэньня дэфіцыту, пашыраць асыгнаваньні на больш шырокія сацыяльна-культурныя выдаткі. Але мы і тут, з прычыны слабасьці нашага бюджэту, мяркуем атрымаць дапамогу з боку Саюзу на пабудову ўнівэрсытэту ў Менску, які патрабуе вялізныя выдаткі: толькі на першы год—1 з паловай міл. руб. Калі залічыць гэтыя 1 з пал. млн. да выдаткаў па Народнаму Камісарыяту Асьветы, то рост выдаткаў на народную асьвету складзе 33,3 пр.; па рэспубліканскаму бюджэту каштарыс НК Асьветы вырастае толькі на 10,3 проц. Прынамсі такі-ж рост 8-10 проц. на сацыяльна-культурныя выдаткі, бярэцца па ўсяму Саюзу цалкам. І зусім правільна, ажыцьцяўленьне лёзунгу індустрыялізацыі краіны, большыя асыгнаваньні на сельскую гаспадарку, на яе машынізацыю і інтэнсыфікацыю не даюць магчымасьці пакуль што больш значным тэмпам павялічваць сацыяльна-культурныя выдаткі.

Пераходзячы да

адміністрацыйных выдаткаў,

я павінен адзначыць наступнае. Мы маем зьніжэньні адміністрацыйных выдаткаў па бюджэту, згодна дырэктывы, якая была дадзена Сэсіяй ЦВК БССР аб патнешні нашага кіраўнічага апарату і аб паніжэньні адміністрацыйных выдаткаў. Мы за мінулы год павялі рацыяналізацыю нашага апарату, пытаньне кіраўнічага апарату і скарацілі яго на 1185 адзінак, альбо на 32,6 проц. па цэнтральных і акруговых установах. Зьліквідаваньне 4-х акруговых цэнтраў, узбуйненьне часткі райёнаў, узбуйненьне сельсаветаў, асабліва па тэрыторыі Гомельшчыны,—усе гэтыя мерапрыёмствы ўраду далі магчымасьць паменшыць выдаткі на кіраваньне, адміністр.-гасп. выдаткі на 19,4 проц., альбо на 979.705 руб. у складзе аднаго толькі дзяржаўнага бюджэту, супроць сумы 1926-27 г.

Мы бачым, што і гэта задача таксама выканана і знайшла адбітак у бюджэце на 27-28 год.

Пераходзячы да

зарплаты,

павінен адзначыць, як я ўжо казаў, што ўзрастаючае запатрабаваньне гаспадаркі краіны, барацьба з дэфіцытам бюджэту ва ўмовах недахопу тавараў прамысловасьці, неабходнасьць капітальных затрат для далейшага пашырэньня вытворчасьці—неадкладна дыктуе не падвышаць агульнае заработнае платы, дапускаючы толькі падцягваньне некаторых адстаючых груп, ніжэйшых груп, і павялічэньне заработнае платы спэцыялістым, галоўным чынам, працуючым на вёсцы. І таму павялічэньне зарплаты адбывалася за кошт таго скарачэньня штату, дасягнутае шляхам рацыяналізацыі нашага апарату. Фонд зарплаты павялічваецца на 3 проц. супроць мінулага году, а калі ня лічыць новых ўстаноў і натуральнага ўзросту, то фонд зарплаты зьнізіцца на 2,9 пр., не пагоршваючы матар'яльнага становішча працаўнікоў, атрымоўваючых зарплату па дзяржаўным бюджэце.

Значыць, і ў гэтай галіне, як мы бачым, дырэктыва таксама выканана: матар'яльнае становішча працаўнікоў не пагоршылася, а палепшылася, павялічана зарплата адстаючым групам, павялічана зарплата спэцыялістым, за кошт скарачэньня штатаў у 1185 адзінак.

Вось кароценькая харатарыстыка асобных галоўных вучасткаў нашай гаспадаркі, на якія бюджэт 1927-28 году вылучае сродкі.

Як разьмяркоўваюцца выдаткі па галоўных прадметах назначэньня? Выдатковая частка бюджэту на 27-28 год у 63.147.750 р. разьмяркоўваецца наступным чынам: выдаткі па народнай гаспадацы складаюць 23 з лішкам мілёнаў, альбо 36 проц., гэта значыць узрост на 53,9 проц., выдаткі па сацыяльна - культурныя патрэбы — 11.500.000 р., зьніжаюцца на 7,3 проц., сродкі, якія перадаюцца мясцовым бюджэтам, гэта пераходзячыя сродкі; самы вялікі ўзрост, гэта па фондах—на 48,8 проц. Узрастаньне па фондах адбываецца, галоўным чынам, за кошт павялічэньня субвэнцыённага фонду. Становішча мясцовога бюджэту акруг на 27-28 год знаходзіцца ў горшым становішчы, чым рэспубліканскі бюджэт.

Характарыстыка мясцовых бюджэтаў.

Тыя моманты, аб якіх я гаварыў пры характарыстыцы прыбытковай часткі дзяржаўнага бюджэту, маюць адбітак і ў мясцовых бюджэтах акруг. Зьмяншэньне лясного прыбытку дае адлічэньне мясцовым бюджэтам, потым грашовая наяўнасьць, якая мелася ў мінулым годзе ад астаткаў лясного даходу за 25-26 год у суме 2.500.000 р. зьніжаецца на 27-28 год да 642.000 рублёў.

Вось гэтыя моманты ў прыбытковай частцы мясцовага бюджэту не даюць абсалютнага ўзросту прыбыткаў нашым мясцовым бюджэтам, ня гледзячы на ўзрастаньне мясцовых падаткаў і збораў. Таму без дзяржаўнай дапамогі, бяз субвэнцыі, свод мясцовых бюджэтаў па Беларусі на 1927 г. у параўнаньні з 1926-27 г. зьніжаецца ў прыбытковай частцы на 0,7 пр., а перад мясцовымі бюджэтамі акруг стаіць у 1927-28 г. новыя задачы—гэта павялічэньне пэнсыённага фонду інвалідам вайны на 100 проц., што складае каля 450000, асыгнаваньне сродкаў на Асінастрой у 500.000 р.; стварэньне хлебнага фонду на 900000 р. і павялічэньне заработнай платы за кошт разгортваньня сеткі, таксама за кошт павялічэньня стаўкі зарплаты школьным працаўнікам на вёсцы да тэй стаўкі, якая маецца ў РСФСР; гэта патрабуе павялічэньня ў 2.500.000 руб. Адно толькі павялічэньне заработнае платы з 37 р. 50 к. да 44 р. патрабуе 1.800.000 р.

Таму мясцоваму бюджэту, ня гледзячы на ліквідацыю 4-х акруговых цэнтраў, што дало каля 1.400.000 р. эканоміі, ня гледзячы на ўзбуйненьне часткі райёнаў і сельскіх саветаў за кошт унутранага пераразьмеркаваньня сродкаў—немагчыма без дзяржаўнай дапамогі ажыцьцявіць такія пляны як па дарожнаму, школьнаму будаўніцтву, таксама павялічэньне па зарплаце і выкананьне тых новых задач, якія паўсталі перад мясцовымі бюджэтамі за 27-28 год.

І таму ў бюджэце на 27-28 год прадугледжваецца па фондах дзяржаўная дапамога мясцовым бюджэтам у 2.882.000 р., толькі тады свод мясцовых бюджэтаў па 1927-28 г. дасьць узрост на 9,8 проц. у параўнаньні да выкананьня бюджэтаў за 26-27 год.

СНК лічыў, што гэты ўзрост мясцовых бюджэтаў акруг у сводцы на 9,8 проц. па рэспубліцы зьяўляецца скромным, тады, як па іншых рэспубліках мяркуецца ўзрост мясцовых бюджэтаў на 15-18 проц., а ў нас ён без дзяржаўнай дапамогі падае на 0,7 процантаў.

Ня гледзячы на тое, што ў нас дзяржаўны бюджэт зьяўляецца дэфіцытным і што дапамогу мясцовым бюджэтам можна таксама аднесьці за кошт павялічэньня дэфіцыту, СНК лічыў неабходным вызначыць субвэнцыю мясцовым бюджэтам у 2.882.000 р.

Як разьмяркоўваецца субвэнцыя па асобных відах выдаткаў: на зарплату настаўнікам, каб давясьці стаўку з 40 р., якія яны атрымоўваюць зараз, да 44 р.,—1.132.000 р., на школьнае будаўніцтва, для ажыцьцяўленьня пляну школьнага будаўніцтва—750.000 р., альбо 50 проц. пляну, на дарожнае будаўніцтва—900.000 р. на барацьбу з бяспрытульнасьцю—100.000р.

Банкаўская дапамога.

Ня гледзячы на ўзрост апераджаючы ўзрост Саюзнага бюджэту, наш рэспубліканскі дзяржаўны бюджэт яшчэ ня можа цалкам задаволіць усіх гаспадарчых і культурных запатрабаваньняў нашай краіны; яшчэ недастаткова па дзяржаўным бюджэце мера задаваленьня нашых патрэб.

У гэтых адносінах нам ідуць на дапамогу банкі. Я прывяду лічбы на 1-X-27 г. і на 1-X-26 г.—як узрастаюць банкавыя апэрацыі, якіх таксама нельга ня лічыць,—яны маюць уплыў на ўзрастаньне нашай гаспадаркі.

Вучотна-пазычальныя апэрацыі па ўсіх банках на 1-X-26 г. складалі 31 з лішкам мільёнаў руб.; на 1-X-27 г.—44.000.000 руб., мэтавыя пазыкі: на 1-X-26 г.—24 з паловай мільёны і на 1-X-27 г.—52.900.000 руб.

Значыць, у нашую гаспадарку банкамі ўкладваецца сродкаў на 97,8 мілёнаў якія садзейнічаюць узрастаньню гаспадаркі нашай краіны.

Але тут трэба адзначыць падзеньне ўкладаў і бягучых рахункаў у банках. Калі на 1-X-26 г. уклады па ўсіх банках дасягалі 15 з паловай мільёнаў, дык на 1-X-27 г. толькі 13 з паловай мільёнаў. Гэта тлумачыцца з'аднаго боку памяншэньнем сродкаў у самой прамысловасьці, сродкаў, якія хаваліся бы на бягучыя рахункі, а з другога боку хаваньнем сродкаў насельніцтвам у сябе і неўкладаньнем іх у дзяржаўныя каналы. Таму, каб па оўніць недахоп, прадугледжваемы па бюджэту і па крэдытных пляцах нашых банкаў, неабходна, каб кожная капейка селяніна, рабочага і іншага працоўнага не хавалася ў хаце, а заносілася ў дзяржаўныя каналы— касы ашчаднасьці, у каапэрацыю, у пазыкі і г. д. Толькі пры напаўненьні бюджэтных сродкаў і пашырэньні крэдыту з дапамогаю сродкаў самаго насельніцтва магчыма павялічыць абслугоўваньне запатрабаваньняў нашай краіны.

Закон аб самаабкладаньні.

Таварышы ў спрэчках па дакладу т. Галадзеда ўжо адзначалі тыя недахопы, якія адчуваюцца на мясцох з-за недахопу сродкаў, напрыклад у школьным будаўніцтве, што за 5000 руб. нельга пабудаваць школу; невялічкія мосьцікі, якія павінны будавацца самым насельніцтвам, парою не рамонтуюцца таму, што ініцыятыва большасьці насельніцтва вёскі зрывалася асобнымі адзінкамі і тым самым не праводзіліся ў жыцьцё тыя добрыя пачынаньні, якія выказываліся пастановамі і рашэньнямі, якія прымаліся гэтымі сходамі.

Ужо маецца дырэктыва ўраду, каб на падставе закону Саюзнага ўраду распрацаваць закон аб самаабкладаньні насельніцтва на гаспадарчыя і культурныя патрэбы сяла.

Калі возьмеце шляхі, масты, школы, больніцы, фэльчарскія пункты—усюды вы ўбачыце, што бюджэт ня можа задаволіць дастатковай колькасьцю сродкаў, каб ахапіць усе патрэбы, і што мы ня можам павялічыць у такой меры падатак на сялянства, бо гэта зруйнавала-б сельскую гаспадарку, калі падатак не ў меры быў вызначан для ўзіманьня на сяле. Таму папаўненьне сродкаў, неабходных для задаваленьня нашых запатрабаваньняў, не павінна ісьці па лініі павялічэньня падатковага цяжару, а толькі ўдасканаленьня, што мы і робім кожны год, выпраўляючы закон аб сельгаспадатку больш правільна, каб падатак раскладваўся паміж асобнымі групамі гаспадаркі з тым, каб больш аслабаніліся беднякі, каб прытрымліваліся кулакі, каб уся вёска шла ўсёй масай уперад па шляху аднаўленьня сваёй гаспадаркі.

Але ў агульных сумах, зразумела, зьмяненьні сельгаспадатку не дадуць н

Дзяржаўны бюджэт БССР на 1927-28 год.

Працяг дакладу тав. Мікуліча.

Касы ашчаднасьці.

Паступнай крыніцай папаўненьня сродкаў служаць нашыя ашчадныя касы. Уклады ў іх узрастаюць хоць і хуткім тэмпам, але па абсалютнай сваёй суме яшчэ так нязначны, што супакоіцца на тых дасягненьнях, якія мы маем, ніяк нельга.

Калі на 1 кастрычніка 26 году ва ўсіх ашчадных касах быў ліпак укладаў каля паўтара мільёны, да 1 сьнежня 27 году мы маем 4,220,000 руб. Але калі параўнаць гэтыя лічбы з даваенным становішчам, дык мы бачым, што мы яшчэ далёка адсталі. У прыватнасьці аб ашчаднай справе на вёсцы. Хоць колькасьць укладчыкаў на сяле ўзрастае, але яшчэ траба ў гэтай галіне пажадаць значна лепшых вынікаў.

Сродкаў у нашага насельніцтва даволі мно а: маюцца гаспадарчыя распрацоўкі лесу, даючыя аграмаднейшыя сродкі сялянству, дарожнае будаўніцтва, школьнае будаўніцтва, шасэйнае будаўніцтва і г. д., усе сырызныя заготоўкі,—усё гэта дае аграмаднейшыя сродкі нашай вёсцы, якія пры недахопе тавараў хаваюцца ў самаго насельніцтва. Трэба, каб гэтыя сродкі скарыстоўваліся ў інтарэсах дзяржавы, прынесьлі-б карысьць і самаму трымаўцу гэтых сродкаў, а таксама і дзяржаве ў справе зьдзейсьненьня індустрыялізацыі краіны, аднаўленьня сельскай гаспадаркі, павялічэньня выдаткаў на сацыяльна-культурныя патрэбы.

Пазыка аднаўленьня сельскай гаспадаркі

Урад Саюзу прыняў рышэньне аб выпуску займу аднаўленьня сельскай гаспадаркі ў 100 міл. руб. Недахоп сродкаў і ў саюзным масштабе для ўсё большага разгортваньня нашай прамысловасьці, для больш буйнейшых затрат на прамысловае будаўніцтва патрабуе прыцягненьня свабодных, а часам нават вылучэньня необходных і для ўласных выдаткаў сродкаў працоўнымі. Дзеля таго, каб дапамагчы дзяржаве аднаўляць і зьдзейсьняць індустрыялізацыю краіны і перавадзіць сельскую гаспадарку на машынны спосаб апрацоўкі, быў выпушчан заём індустрыялізацыі, аб якім вы ўсе, відавочна, ведаеце. На нашу долю Саюз меркаваў, што мы павінны рэалізаваць 2 міл. руб. займу індустрыялізацыі на тэрыторыі БССР. Заём індустрыялізацыі ра паўсюджваўся галоўным чынам сярод гарадзкога насельніцтва, сярод рабочае клясы, сярод працоўных гораду. Працоўныя гораду і рабочая кляса выканала з перавышкай гэтыя меркаваньні, на якія разьлічаў Саюзны ўрад.

Калі на нас разьлічвалі, каб мы рэалізавалі 2 міл. руб., то па БССР заём індустрыялізацыі рэалізаван у 2.702.52 руб., г. зн. перавышэньне на 35,1 проц. Гэтыя лічбы, т. т., паказваюць, як адазвалася рабочая кляса, як адазваліся працоўныя гораду ў справе дапамогі свайму-жа Рабоча-Сялянскаму Ўраду ў зьдзейсьненьні гэтай аграмаднейшай задачы па індустрыялізацыі краіны.

Цяпер, т. т., задача стаіць перад вёскаю. Пазыка індустрыялізацыі была выпушчаны ў 200 міл., пазыка аднаўленьня сельскай гаспадаркі—у 100 міл. руб. У нас гарадоў, вы ведаеце, нямнога і гарады невялікія, мы выкавалі заданьне па пазыцы індустрыялізацыі звыш на 35,1 проц. На рэалізацыю-ж займа сярод сялянства Саюз разьлічвае таксама ў 2 міл. руб. тагды, калі сялянская насельніцтва ў некалькі разоў больш. І пагэтаму, каб сялянства магло шырэй сваёю масаю ўдзельнічаць у рэалізацыі займу, аблігацыі для аднаўленьня сельскай гаспадаркі будуць выпушчаны дробнымі купюрамі, пачынаючы з 2 р. 50 к. Гэта дасьць магчымасьць нават малаоцэнаму гаспадару купіць частку аблігацыі. Аблігацыя дае выйгр. у 7 пр., а процант па купюрах—6 проц.

Акрамя важнейшага моманту, аб якім адзначаў т. Галадзед у сваім дакладзе, што 10 проц. ад сумы, рэалізуемай па райёну, будзе заставацца ў райёне, як дадатковыя сродкі да бюджэту райёну на мясцовую гаспадаркі ці культурныя патрэбы райёну, мы павінны ў кампаніі, якую будзем праводзіць на вёсцы, адзначыць усебакова тыя выгады, якія дае пазыка аднаўленьня сельскай гаспадаркі як трымаўцы займу, так і Рабоча-Сялянскаму Ўраду.

Толькі пры актыўным удзеле працоўных гораду і вёскі мы зможам шпарчэй прасоўвацца яшчэ ў далейшым у справе аднаўленьня нашай гаспадаркі і здавальненьня сацыяльна-культурных патрэбаў гораду і вёскі і зьдзейсьненьня таго пляну, цэлай праблемы, якую мы ўчора скончылі абгаварэньнем—сыстэмы народнае асьветы.

Па нашых прыблізных разьліках на гэта патрабуюцца вялікія сродкі. На працягу двух дзесяткаў год мясцовы бюджэт бяз удзельнічаньня насельніцтва, дапамогі дзяржаўнага бюджэту, павінен будзе многа больш чым на палавіну абярнуцца ў бюджэт народнай, асьветы.

Праўда, гэта толькі грубыя папярэднія падлікі. Адсюль трэба зрабіць вынік, што толькі актыўны ўдзел самога насельніцтва забясьпечыць выкананьне ўсіх тых плянаў, якія намячаюцца на бліжэйшы год.

(Воплескі).

Садаклад тав. Калніна.

Таварышы, уперад за ўсё некалькі заўваг. Я ня буду дакладываць аб мясцовым бюджэце, бо ў час працы Бюджэтнай Камісіі, мясцовы бюджэт знаходзіўся ў такім становішчы, што Бюджэтная Камісія не магла даць па ім якое-небудзь заключэньне. У сувязі з гэтым Пленум Бюджэтнай Камісіі даручыў Прэзыдыуму Бюджэтнай Камісіі пасьля афармленьня мясцовага бюджэту даць па ім заключэньне Прэзыдыуму ЦВК. Другая заўвага: я ня буду датыкацца тых лічбаў па дзяржаўнаму бюджэту, а пералічу толькі тыя лічбы, на якіх Бюджэтная Камісія прапанавала тыя зьмены ў бюджэце і тыя вывады, якія Бюджэтная Камісія зрабіла пры разглядзе бюджэту.

Выкананьне дзяржаўнага бюджэту.

Бюджэтная Камісія ўперад заўсё разглядзела пытаньне аб выкананьні дзяржаўнага бюджэту ў мінулым 26-27 годзе. Мы па гэтым пытаньні канстатуем тыя моманты ў лічбовых выражэньнях, якія даў дакладчык ад Савету Народных Камісараў, але ў той-жа час мы лічым, што ў будучыне пры справаздачы і пры складаньні дзяржаўнага бюджэту трэба ўнесьці некаторыя зьмены дзеля таго, каб палегчыць разгляд дзяржаўнага бюджэту. Перш за ўсё Бюджэтная Камісія таксама канстантавала па шэрагу матар'яльных фактаў невыкананьня бюджэтнай дысцыпліны за мінулы бюджэтны год. Ня буду гаварыць падрабязна аб гэтых фактах, пералічу толькі характар іх: мы мелі выкарыстаньне сродкаў і дзяржаўных крэдытаў не па простым прызначэньні, мы мелі факты неэканомнага выдаткаваньня гэтых сродкаў, мы мелі таксама выпадкі несвачасовага ажыцьцяўленьня тых плянаў, якія намечаны па бюджэту. Такім чынам мы маем яшчэ цэлы шэраг недалікаў у галіне выкананьня бюджэту, якія цяжарыць у боку розных дзяржаўных органаў, што знаходзяцца на дзяржаўным бюджэце. Мы лічым, што ў пытаньнях бюджэтнай дысцыпліны ў далейшым трэба ўзяць цьвёрдую і рашучую лінію ў тым сэнсе, каб зьнічыць ня толькі выпадкі неэканомнага і безгаспадарлівага выдаткаваньня сродкаў, але і правесьці такія мерапрыёмствы, каб і сьлядоў ад гэтых хібаў не пакінуць. Таксама мы лічым немагчымым дапусьціць у далейшым у якой небудзь меры выдаткаваньне не па простаму прызначэньню тых сродкаў, тых спэцыяльных сродкаў, якія вызначаны на мэтавыя ўстаноўкі. Таксама ні ў якім выпадку недапусьцімы такія факты, якія мы мелі ў мінулым бюджэтным годзе, як скарачэньне тэрміну выдачы пазычак на фонду беднаты і адначасовае павялічэньне процанту за выкарыстаньне гэтых пазычак, што яўна парушала існуючыя законы. Я павінен сказаць, што як па лініі Наркамфіну, так і па лініі Наркамата РСІ цэлы шэраг такіх парушэньняў бюджэтнай дысцыпліны быў ададзены пад суд і будзе адказваць перад пралетарскім судом за невыкананьне законаў, выпрацаваных рабочымі і сялянамі. У будучыне пры выкананьні дзяржаўнага бюджэту трэба будзе зьвяртаць больш увагі з боку Дзяржаўнага Кантролю на пытаньні кантролю ў сэнсе правільнага выдаткаваньня сродкаў па галоўных лініях, як-та: па лініі гаспадарчага будаўніцтва і г. д. Па гэтай лініі ў нас адпускаюцца вялізарныя сродкі, а выдакаваньне гэтых сродкаў часам ідзе не па прамому прызначэньні. Есьць выпадкі, калі сродкі, якія адпускаюцца па дзяржаўнаму бюджэту на гаспадарчае будаўніцтва, бяруць тыя ці іншыя органы нібы-та на ажыцьцяўленьне гэтых гаспадарчых плянаў, але мы ня маем праверкі выкананьня выдаткаваньня гэтых сродкаў, г. зн. ці ў поўнасьці і ў сапраўднасьці гэтыя сродкі выдаткаваны на гаспадарчае будаўніцтва. Магчымы і такія выпадкі, калі з касы Наркамфіна гэтыя сродкі бяруць і ў той жа самы дзень перапоўнае павялічыць падатак ад спадчыны і здаровьняў занест 35000 руб.—43000 р. Зробленыя падлікі поўнасьцю пацьвярджаюць, што гэту суму можна ўключыць.

Тав. КАЛНІН.

носяць іх на бягучы рахунак. Такім чынам па лініі Наркамфіну выходзіць, што як быццам сродкі ўзяты на гаспадарчае будаўніцтва, а фактычна яны ляжаць у якім-небудзь банку, і мы ня ведаем, як гэтыя сродкі на справе выдаткоўваюцца. З гэтага пункту погляду трэба, каб Дзяржаўны Кантроль зварачываў на гэтае пытаньне больш увагі, чым у мінулым годзе.

Бюджэтная Камісія лічыць патрэбным, каб у далейшых справаздачах аб выкананьні бюджэту ў будучыне Наркамфін зьвяртаў больш увагі эканамічнаму аналізу выпаўненьня бюджэту. Мы, зразумела, не патрабуем такога дэталёвага эканамічнага аналізу, у якім прадугледжвалася-б поўная справаздачасьць у выдаткаваньні пасобных сум, мы не патрабуем, напрыклад, каб у эканамічным аналізе была характарыстыка, ці правільна разьмеркаваны варштаты або ці правільна ўстаноўлен фабрычны коміна на новапабудованай фабрыцы, але мы патрабуем такога аналізу ў справаздачы па выкананьні бюджэту, які паказаў бы, ці сапраўдна выдаткаваны сумы, асыгнаваныя на гаспадарчае будаўніцтва, які эфэкт далі гэтыя сумы, які рост валавой прадукцыі атрымаўся і г. д. Ці, напрыклад мы патрабуем такога аналізу, які-б характарызаваў, ці ажыцьцяўлены, скажам, плян мэліярацыі, на каторы асыгнована поўнай колькасьць сродкаў. Толькі пры гэткім аналізе мы зможам арыентавацца ў далейшым і зрабіць адпаведныя эканамічныя і палітычныя вывады.

Прыбытковая частка бюджэту.

Бюджэтная камісія ўносіць у даходную частку бюджэту некаторыя папраўкі. У агуле мы лічым, што прыбытковая частка бюджэту складзена правільна, трэба ўнесьці некаторыя папраўкі, частка з якіх ня біла ўлічана Наркамфінам пры складаньні дзяржаўнага бюджэту і ня было магчымасьці таксама зрабіць больш поўныя падрабязныя падлікі.

Перш за ўсё мы ўносім прапанову аб павялічэньні прамысловага падатку замест намечанай сумы 6435000 р. (я буду гаварыць у круглых лічбах) мы прапануем—6710000 р. Гэтыя падлікі, якія зрабіла бюджэтная камісія, поўнасьцю і цалкам пацьвярджаюць, што гэткае павялічэньне можна зрабіць.

Наступнае: бюджэтная камісія прадасьць магчымасьць прыбытак ад лясоў павялічыць, бо ны правідловым вядзеньні гаспадаркі і правядзеньні лесаўпарадкаваньня мы зможам дамагчыся павялічэньня прыбытку ад лясоў. Мы маем цэлы шэраг фактаў аб тым, што там, дзе ўжо праведзена лесаўпарадкаваньне, там выяўляецца большая магчымасьць эксплёатацыі лесу.

Вось усё, што можна сказаць адносна прыбытковай часткі.

Выдатковая частка бюджэту.

Перш за ўсё бюджэтная камісія прапануе скараціць выдатковую частку па Народнаму Камісарыяту Ўнутраных Спраў на 99000 руб.

Гэтая сума складаецца: 1) у зьвязку з пашырэньнем працы арганізацыйнага аддзелу Прэзыдыуму ЦВК за кошт працы арг. аддзелу Народнага Камісарыята Ўнутраных Спраў. З гэтым разьмежаваньнем некаторая частка працы перадасьцца арганізацыйнаму аддзелу ЦВК і адыходзіць поўная сума каля 4000 руб. непасрэдна ў каштарыс ЦВК; 2) у зьвязку з кастрычнікавай амністыяй дамы зьняволеньня скараціліся на вялікую колькасьць і таму выдаткі можна скараціць на 50000 руб. на ўтрыманьне гэтых дамоў; 3) у зьвязку са скарачэньнем выдаткаў на 45000 руб., гэта выходзіць з таго, што зараз па каштарысу НК Унутраных Спраў уключана ўтрыманьне крымінальнага вышуку, які непасрэдна абслугоўвае Менскую округу. Таму яго павінна перанесьці на мясцовы бюджэт, г. зн. на бюджэт Менакрвыканкому. Усё гэта складае 99.000 руб.

Наступнае скарачэньне па Наркамфіну. Па Наркамфіну была запазычанасьць—Наркамфіну Саюза ССР. Наркамфін гэтую суму сьпісаў. Такім чынам яна адыходзіць. Гэтую суму ўключаць у дзяржбюджэт ня трэба.

Скараціць выдатковую частку па ВСНГ па яго апарату на 10.260 руб., па іншых наркаматах скарачэньняў па думцы бюджэтнай камісіі рабіць ня трэба.

Якія маюцца дапаўненьні? Перш за ўсё бюджэтная камісія ўносіць дапаўненьні адносна НК Сабесу: павялічыць яго выдаткі на 50.175 руб. для павялічэньня пэнсій. Потым павялічвае на 12.000 руб. па НК Земляробству па некаторых артыкулах. Па каштарысу ВСНГ уключыць 60.000 руб. на ўтрыманьне палаты мер і вагі. Я ўжо дакладваў, што прыбытковая частка палаты мер і вагі ўваходзіць у прыбытковую частку дзяржбюджэту, на ўтрыманьне прапануецца адпусьціць 60.000 руб. Потым уносім дапаўненьне па кватэрнаму будаўніцтву, з тым, каб суму, адпускаемую па дзяржбюджэту, павялічыць на 30.000 руб. Па бюджэту арыентыровачна было намечана 70.000 руб. Зразумела, гэта ня поўная сума на кватэрнае будаўніцтва, сюды яшчэ адпускаюцца сродкі з крэдытаў Камбанку, прамысловасьці, а тут гэта толькі бюджэтная сума для павялічэньня сродкаў кватэрнай каапэрацыі.

Потым мы прапануем уключыць 100.000 руб. на камунальную гаспадарку. Гэта сума памылкова ня была ўключана ў дзяржбюджэт Па дзяржбюджэту ў росьпісі маецца 200.000 руб., а па сутнасьці павінна быць 300.000 руб., бо ёсьць адпаведная дамоўленасьць з саюзнымі органамі аб тым, каб у бюджэт уключыць 300.000 руб.

Затым, прапануем павялічыць некаторыя фонды: на фінансаваньне друку 150.000 руб. і на субсыдыі газэтам 70.000 руб.

Такім чынам выходзіць, што мы прапануем павялічыць выдатковую частку дзяржаўнага бюджэту прыблізна на 350.000 руб. Наогул атрымліваецца ў зьвязку з тымі зьменамі, аб якіх я гаварыў, па выдатковай частцы, прыкладна, 63.500.000 руб. ці мы зьмяншаем дэфіцыт па паўміліёна рублёў.

Бюджэтная камісія таксама разглядала пытаньне—ці досыць зьніжаны адміністрацыйна-кіраўнічыя выдаткі. Бюджэтная камісія адзначае, што ўрадам у гэтай справе праробленa вялізарная праца, але яшчэ неабходна пасьля сэсіі ўзяць і яшчэ раз пераглядзець і там, дзе магчыма, зьвініць адміністрацыйна-кіраўнічыя выдаткі, і ў той-жа час праводзіць мерапрыёмствы ў працягу году па зьніжэньню гэтых выдаткаў.

Зараз дырэктыва аб скарачэньні выканана на 19,4 проц., але трэба ад застаўшайся сумы пайсьці па магчымасьці далей, бо наколькі будуць зьніжаны адміністрацыйныя выдаткі, застанецца больш сродкаў на гаспадарчае будаўніцтва, якое зьяўляецца для нас асновай усей працы.

Мы лічым, што тое разьмеркаваньне сродкаў па выдатковай частцы, якое маецца па дзяржаўнаму бюджэту, зусім правільна і грунтуецца на тэй палітыцы, якую праводзіць Рабоча-Сялянскі Ўрад.

Вось тое, што можна было сказаць адносна выдатковай часткі.

Учора пры абмеркаваньні сыстэмы народнай асьветы гаварылі аб тым, што трэба яшчэ дамагчыся асыгнаваньня больш сродкаў на культурныя патрэбы, і вось т. Грозная гаворыць: «Трэба павялічыць у вёсцы сродкі на хаты чытальні, для чаго трэба знайсьці іх». Натуральна, трэба даць вёсцы больш грошай з тым, каб палепшыць становішча хат-чытальнь, клюбаў і ўсяго таго, што датычыцца ня толькі культуры, але і наогул эканомі і нашай краіны, але неабходна выходзіць з аднаго: ці бярэм мы ўсё тое, што наша краіна можа даць, і калі гэта так, нам застанецца толькі адно — правільна разьмяркоўваць усе гэтыя сродкі, каб яны аднавядалі сацыялістычнаму будаўніцтву, бо сродкі павінны вызначацца і расходвацца такім чынам, каб яны пайшлі на далейшае ўзмацненьне дыктатуры пралетарыяту, каб сродкі пайшлі па тэй лініі і былі накіраваны на тэй логве, якая-б спрыяла хутчэйшаму будаўніцтву сацыялізму. І мне здаецца, што ўрад пры распрацоўцы бюджэту іменна з гэтага выходзіў і таму бюджэтная камісія ЦВК лічыць, што сродкі ў выдатковай частцы палкам накіраваны зусім правільна.

У канцы я спынюся на некаторых пытаньнях, якія мы лічым неабходным у далейшым так ці інакш уключыць і якія павінны адбіцца ў адпаведнай пастанове Сэсіі ЦВК.

Папершае, гэта пытаньне аб тым, што неабходна дамагчыся прысьпешаньня прахаджэньня бюджэту праз усе інстанцыі, па якіх праходзіць бюджэт, і гэтым самым дамагчыся таго, каб дзяржаўны бюджэт прысьпешаным тэмпам разглядаўся і зацьвярджаўся. Па сутнасьці дзяржаўны бюджэт — гэта ёсьць плян працы на цэлы год, і гэты плян трэба разглядаць і зацьвярджаць як магчыма бліжэй да пачатку гаспадарчага году, а не адносіць да 2-га кварталу ці да пачатку 2-га кварталу новага гаспадарчага году. Трэба паставіць так задачу, каб спрасьціць прахаджэньне бюджэту праз цэлы шэраг дзяржаўных арганізацый з тым, каб прысьпешыць разгляд бюджэту. Аднясеньне разгляду бюджэту бліжэй да пачатку гаспадарчага году дасьць магчымасьць усім органам, праходзячым па дзяржаўнаму бюджэту, так пабудаваць свой плян працы і так накіраваць сваю працу, каб гэтыя органы паступова яго выконвалі, каб ужо ў пачатку бюджэтнага году яны ведалі, якія сродкі будуць мець і якія мерапрыёмствы ў працягу году павінны будуць правесьці.

Неабходна ўжыць меры да таго, каб абавязаць усе дзяржаўныя і гаспадарчыя органы, каб яны своячасова пачалі ажыцьцяўляць усе тыя мерапрыёмствы і будаўніцтва, якія прадугледжваюцца гэтым бюджэтам, і каб плян гатай працы быў своячасова распрацован і своячасова можна было распачаць працу.

Што датычыць пытаньня скарачэньня прахаджаньня праз шэраг арганізацый, па якіх павінен праходзіць дзяржаўны бюджэт, дык ужо маюцца пастановы з боку ўраду, што трэба будзе ў далейшым яшчэ ўдакладніць, яшчэ прасачыць, што магчыма скараціць.

Далей, адным з пунктаў, які таксама павінен мець адбітак у рэзалюцыі, зьяўляецца пытаньне аб тым, каб разьмежаваць прыбыткі і выдаткі дзяржаўнага і мясцовага бюджэту. У нас яны разьмежаваны, але маюцца яшчэ некаторыя рэшткі, якія трэба так ці інакш у працягу гэтага году прасачыць, пераглядзець усе прыбытковыя крыніцы, і тыя, якія павінны быць аднесены да округаў, трэба перадаваць акрузе, а таксама па выдатковай частцы трэба аднесьці да округі тое, што трэба даць акрузе, і тыя, якія павінны быць аднесены да дзяржаўнага бюджэту, трэба ўключыць у дзяржаўны бюджэт.

Па сутнасьці пры распрацоўцы гэтага пытаньня можа прыдзецца пераглядзець некаторыя прыбыткі з тым, каб з дзяржаўнага бюджэту перадаваць на мясцовы бюджэт.

У нас да гэтай пары па дзяржаўнаму бюджэту ня было сум для шляхавага будаўніцтва. Неабходна гэта прадугледзіць і ўключыць у бюджэт.

І апошняе пытаньне—гэта пытаньне аб тым, што бюджэтная камісія лічыць, што для таго, каб ухіліцца ад цэлага шэрагу непармальнасьцяў у сэнсе фонду беднаты, у сэнсе розных мэтавых назначэньняў, дык мы лічым, што неабходна ўстанавіць гэткі парадак, што цэнтральныя ўстановы, якія па бюджэту атрымліваюць асыгнаваньні на тыя ці іншыя патрэбы, каб пры разасыгнаваньні гэтых сродкаў па райёнах і акругах, вызначыць гэтыя сродкі так, каб райвыканкомы і сельсаветы ведалі, якія сумы па кожнаму фонду, па кожнаму выдатку, які прыпадае на адпаведны РВК і сельсавет.

Пры гэтым магчыма будзе ўнікнуць тых памылак, якія мы ў гэтым годзе мелі, гэта дасьць магчымасьць чам з боку мясцовых органаў наглядаць, ці атрымлівае беднота тыя сродкі, якія даюцца па фонду дапамогі беднаце. Гэта дасьць магчымасьць прасачыць, як адпускаюцца сумы для мэтавага прызначэньня, для палепшаньня сельскай гаспадаркі і яны змогуць бачыць ці правільна адпускаюцца грошы па адпаведных крэдытных таварыствах. А калі мясцовыя органы ня ведаюць, колькі прыпадае па яго райён, дык натуральна, што ні ў якім выпадку нельга правесьці і прасачыць правільнасьць выдаткаваньня гэтых сродкаў, правільнасьць водпуску гэтых сродкаў і своячасовасьць атрыманьня гэтых сродкаў.

У гэтым напрамку павінна быць зроблена максымум таго, што толькі магчыма зрабіць, каб райвыканкомы, як на дзяржаўнаму, так і па мясцоваму бюджэту ведалі поўнасьцю аб усіх тых сродках, якія адпускаюцца па мэтавыя прызначэньні, таксама як і гарсаветы павінны ведаць, якія сумы адпускаюцца па таму ці іншаму выдатку, які датычыцца гораду.

Намойму гэта ня цяжка, але гэту вялікую задачу трэба паставіць.

Я ўжо гаварыў аб тым, што наш бюджэт досыць напружаны. Але, я думаю, што калі ўсе рабочыя і сяляне ўявяць сабе важнасьць задач, якія перад намі стаяць, важнасьць ажыцьцяўленьня нашых плянаў і пакладуць усе сілы для таго, каб на справе ажыцьцявіць усе намечаныя мерапрыёмствы, калі рабочыя і надалей будуць актыўна весьці працу рацыяналізацыі нашай прамысловасьці і гандлёвага апарату, калі сялянства будзе своячасова плаціць свае падаткі, даваць свае зьбераженьні на дзяржаўныя пазыкі і г. д., дык гэта дасьць магчымасьць цалкам ажыцьцявіць наш дзяржаўны бюджэт і гэта будзе новым крокам наперад да пабудовы сацыялізму (воплескі).

ПАГРОЗА РАЗГОНУ ШАНХАЙСКІХ ПРАФСАЮЗАЎ.

ТОКІЁ. 11-1. Водлуг паведамленьняў з Шанхаю, „камітэт замірэньня працы з капіталам" зьвярнуўся да паліцыі з патрабаваньнем распусьціць усе рабочыя саюзы.

* * *

ШАНХАЙ, 10-I. Водлуг газетных паведамленьняў, кітайская гандлёвая палата Шанхаю дамагаецца роспуску ўсіх шанхайскіх прафсаюзаў.

У АСТРОГАХ 500 КАМУНІСТАЎ.

ПЕКІН, 11-1. З Ханькоу паведамляюць, што ў астрогах Учана, Ханьяна і Ханькоу знаходзіцца 500 камуністаў і левых дзеячоў рабочага руху, якія будуць аддадзены пад суд.

У Ханькоу сотні арыштаваных.

ШАНХАЙ, 10-1. Водлуг паведамленьня шанхайскіх газэт, у Ханькоу арыштавана некалькі сот партовых рабочых і «20 радыкальных лідэраў", у якіх быццам знойдзена „бальшавіцкая літаратура".

Ангацьзюн бяз грошай.

ХАРБІН, 11-I. Японская газэта «Хотэн Сомбун» паведамляе, што пекінскі ўрад прад свайго камісара Ян-Цзы-Ліна загадаў мукденскаму губернатару Лю даць на вайсковыя патрэбы 50 міліёнаў даляраў. Лю згадзіўся даць 30 міліёнаў даляраў. Рэшта-ж 20 міліёнаў даляраў будуць дадзены Гірынскаю і Хэйлунцзянскаю правінцыямі.

ПРОЦІ ПРЫВІЛЕГІЙ ЧУЖАЗЕМЦАМ.

ШАНХАЙ, 10-I. Кітайскія выплатчыкі падатку ў Шанхаі падалі патрабаваньне, каб месцы ў муніцыпалітэце міжнароднага кварталу разьмяркоўваліся між кітайцамі і чужаземцамі прапарцыянальна суме выплачваемых тымі і іншымі падаткаў.

Тав. Пахвалінскі ў Токіё.

ТОКІЁ, 11-I. У Токіё прыехаў генэральны консул СССР у Кантоне т. Пахвалінскі.

АМЭРЫКАНСКІ ІМПЭРЫЯЛІЗМ УЗБРОЙВАЕЦЦА.

ПАБУДОВА ДЗЕСЯТКАЎ КОВЫХ ВАЙСКОВЫХ СУДНАЎ.

ВАШЫНГТОН, 11-1. Марскі міністр Вільбур падаў у кангрэс законапраэкт аб асыгнаваньні 725-ці міліёнаў даляраў на пабудову ў працягу 5-ці гадоў 25-ці крэйсэраў па 10 тысяч тонн, 5-ці авіаносцаў, 9-ці мінаносцаў і 32-х вялікіх падводных лодак.

Матывуючы гэтую суднабудаўнічую праграму, Вільбур заяўляе: «Той факт, што Англія дамагаецца пабудовы для сабе крэйсэраў параўнаўча вялікага таннажу, зьяўляецца найбольш важкім доказам, што яна таксама адчувае патрэбу ў павялічэньні крэйсэрскага таннажу". Далей Вільбур заяўляе„: Нашы купцы і фабрыканты павінны мець магчымасьць трымаць замежныя рынкі, на якіх мы замацаваліся, а па меры таго, як у Эўропе аднаўляецца нармальнае становішча, мы павінны шукаць і новых рынкаў для нашае прадукцыі. Посьпех гэтае барацьбы шмат у чым залежыць ад прэстыжу, які стварае дзяржаве сучасныя крэйсэры.

„ПРЫЗНАНЬНЕ" САВЕЦКАЕ НАФТЫ У АНГЛІІ.

ЛЁНДАН, 5-I. Колькасьць прадаваемай у Англіі савецкае нафты так узрасла, што РОПП (таварыства па продажы савецкае нафты ў Англіі) пастаўлен перад необходнасьцю пашырыць існуючую сыстэму разьмяркоўваючых устаноў і месца для сховані нафты ў Англіі. РОПП мае 23 разьмяркоўваючых цэнтры ўнутры Англіі і 4 у ангельскіх партох. Мяркуецца адчыніць месцы для сховы нафты яшчэ ў трох партох—Тоўтгемптоне, Гулі і Пендэрлендзе, а таксама ў 8 партовых гарадох.

Ангельская спроба нажыму на Аўганістан

ЛЁНДАН, 10-1. Спэцыяльны карэспандэнт «Вэстмінстэр Газэт» паведамляе: «Пэрсія перапоўнена расейскімі камуністычнымі агентамі, а між тым пэрсідзкі ўрад, як відаць, выказвае гатоўнасьць зачыніць вочы на шкоднасьць камуністычных тэорый, імкнучыся разьвіць свой гандаль. Аўганістан уяўляе сабою буфэрную дзяржаву між Пэрсіяй і Індыяй, і, бязумоўна, меркаваньні, пададзеныя вышэй, узяты пад увагу ангельскім міністэрствам замежных спраў у зьвязку з надыходзячым прыездам аўганскага падышаха ў Лёндан».

ВЭНГЕРСКАЯ РЭАКЦЫЯ РАЗЬВЯЗВАЕ САБЕ РУКІ

«Рэформа» крымінальнага кодэксу.

ВЕНА, 11-I. З Будапэшту паведамляюць, што палата магнатаў ухваліла законапраэкт аб рэформе крымінальнага кодэксу ў Вэнгрыі. Рэдакцыя кодэксу ўзмацняе меры пакараньня за «мяцежную агітацыю».

Генэральны пракурор Варда, які абараняў законапраэкт, у сваёй прамове вельмі востра нападаў на бальшавізм.

Нямецкія рабочыя адыходзяць ад рэфармізму.

ПЕРАМОГІ ЛЕВАЕ МЕНШАСЬЦІ НА ПРАФСАЮЗНЫХ ВЫБАРАХ.

БЭРЛІН, 11-1. Апазіцыя (левая прафсаюзная меншасьць) атрымала поўную перамогу на выбарах у мясцовы камітэт агульнанямецкага саюзу мэталістаў райёну Дуізбург. У Гохфэльдзе апазіцыя атрымала 90 проц. агульнае колькасьці пададзеных галасоў проці 45 проц. у мінулым годзе, рэфармісты адпаведна 10 проц. проці 45 проц. У Хамборне за апазіцыю было пададзена 65 проц. усіх галасоў, а за рэфармістаў 35 проц. проці адваротных процантных адносін у мінулым годзе.

ПЕРАМОГА БОХУМСКІХ МЭТАЛЁЎЦАЎ.

БЭРЛІН, 9-1. Канфлікт у Бохуме між мэталёўцамі і канцэрнам «Фэрэйн Дэйтшэр Штальвэрке» скончыўся перамогаю рабочых. Адміністрацыя прадпрыёмства канцэрну заявіла аб сваёй згодзе выканаць трацейскую пастанову аб даўжыні рабочага дню.

Да працэсу Грамады.

„Наш Шлягёнд" № 9 паведамляе, што акруговы суд у Вільні ўручыў 8 студзеня г. г. 58 асобам, абвінавачаным у прыналежнасьці да Грамады, акты абвінавачаньня. Працэс, як піша „Н. Ц.», пратрывае шесьць тыдняў.

Польскія эндэкі аб Беларускай Грамадзе.

Польская Чорнасоценная „Газэта Варшавска" (№ 10) зьмясьціла карэспандэнцыю з Вільні аб „арыэнтацыях сярод Беларускай Грамады", у якой між іншым піша: „Наогул трэба сказаць, што ўплыў грамадаўцаў на масы перавышае ўплыў усіх іншых беларускіх партый, якія існуюць у Польшчы".

Пан Ярэміч гоніцца за папулярнасьцю.

„Сялянская Ніва", якая не праліла ніводнай сьлязінкі пры арыштах і разгроме Грамады і нават узмацніла свае напады на яе, а цяпер друкуе дэфэмэтуўныя даносы, быццам б. грамадаўцы вядуць „ціхую агітацыю",—праліваё сьлёзы, што п. Ярэміча дапрашваў сьледчы судзьдзя і што яго цягнуць да адказнасьці „за дэманстрацыю, якая адбылася два гады таму назад у сувязі з асуджэньнем на два гады крэпасьці ядомага беларускага дзеяча кс. Гардлеўскага.

Можна супакоіць п. Ярэміча. Вядома-ж, што польская дэфэнзыва дэманструе сваю „бясстаронасьць" толькі дзеля людзкога вока.

Выхадкі „Кур'ера Віл.".

„Кур'ер Віленскі", які ў сваім часе для людзкога вока „абураўся", што гр. Астроўскага Р. вязі скованага на Вільні разам з бандытамі, зьмясьціў у сваім ілюстраваным дадатку фатаграфіі б. гаўлоў сойму Тарашкевіча, Мятлы, Рак-Міхайлоўскага і Валошына, а разам з імі зьмясьціў фатаграфію бандыты-забойцы.

Паўторныя арышты.

Грам. Я. Шпаркевіч, якога ня так даўно вывусьцілі з Лукішак, зноў арыштована 4 студзеня. Прычына арышту невядома. У той-жа дзень арыштаваны і грам. А Коўш.

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1 гадз. уночы).

У ПОЛЬШЧЫ ЎТВОРАН ПЕРАДВЫБАРЧЫ БЛЁНУ КАМІТЭТ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАГА АДЗІНСТВА.

ВАРШАВА, 12-I. Арганізован перадвыбарчы камітэт блёку рабоча-сялянскага адзінства. Адрас камітэту і гадзіны прыёму ў камітэце абвешчаны ў газэтах. Паліцэйскія прасьледваньні камітэту пачаліся амаль адначасна з яго ўзьнікненьнем. Учора паліцыя арыштавала двух рабочых, якія расклейвалі перадвыбарчыя адозвы камітэту.

ПОЛЬСКАЯ НОТА ЛІТОЎСКАМУ ЎРАДУ.

ВАРШАВА, 12-I. Польскі ўрад адправіў у Коўню праз спэцыяльнага кур'ера ноту, у якой прапануе пачаць польска-літоўскія перамоўленьні ў канцы студзеня ў Рызе. Нота намячае асновы для маючых адбыцца перамоўленьняў, якія павінны пачацца з абмеркаваньня пытаньняў аб руху ў раёне польска-літоўскай граніцы, аб транзіце, аб паштовых, тэлеграфных і чыгуначных зносінах.

Дзеньнік Сэсіі ЦВК.

Учора, 12-га студзеня, на ранішнім пасяджэньні Нарком РСІ тав. Калнін зрабіў даклад на тэму „Рацыяналізацыя і спрашчэньне савецкага апарату». У спрэчках па гэтаму дакладу выступілі наступныя таварышы: Ціпчэнка, Мар'ясін, Барсукоў, Воўк, Аксючыц, Каранеўскі, Сташэўскі, Ракаў, Рачыцкі, Бэнэк, Сьпірын. Пасьля гэтага было заслухана заключнае слова т. Калніна.

Сёньня рана будуць працаваць розныя камісіі.

Увечары адбудзецца заключнае пасяджэньне Сэсіі, на якім будуць прыняты пастановы па ўсіх дакладах і зацьвярджэньне законаў, прынятых паміж 1-й і 2-й сэсіямі ЦВК.

У Саюзе ССР.

НА ХЛЕБАЗАГАТОЎЧЫМ ФРОНЦЕ.

ПАВЯЛІЧЭНЬНЕ НА 33 ПРОЦ

ПЯЦІГОРСК, 10-I. Першая пяцідзёўка студзеня дала павялічэньне хлебазагатовак у параўнаньні з ранейшаю на 33 проц Чакаецца далейшае ажыўленьне кампаніі.

ВАЙНА ХАЛАТНАСЬЦІ Ў ХЛЕБАЗАГАТОЎКАХ.

АРОЛ, 12-I. Звольнен з працы за продаж прыватніку хлеба загадчык Іванаўскае савецкае гаспадарні Кісялёў; ён прыцягваецца таксама да крымінальнае адказнасьці. За наўмышлёе захаваньне ў галіне ўзмацненьня хлебазагатовак звольнен з пасады сэкратар Троцкаўскага сельснога камітэту Бязбабічаў. Прыцягваецца да партыйнае адказнасьці за дапушчэньне перавышэньня цэн дырэктар Харчтросту Клішын і старшыня праўленьня губвыканка с.-г. таварыства Конанаў.

За невыкананьне дырэктыў аб узмацненьні хлебазагатовак звольнен з пасады старшыня лівенскага с.-г. саюзу Гуляеў. Справа аб ім перададзена ў губКК.

ПРЭМІІ ЛЕПШЫМ ЗАГАТОЎЦАМ.

ДНЕПРАПЯТРОЎСК, 12-I. Праўленьне спажывецкага саюзу выдала премію 23 суграмадзянам сельскіх спажывецкіх таварыстваў за пасьпяховае правядзеньне хлебазагатоўчае працы.

КАМСАМОЛЬЦЫ НА ХЛЕБАЗАГАТОЎКАХ.

АРМАВІР. 12-I. У станіцы Нявінна-Высокай на камсамольскім сходзе ўсе 270 прысутных камсамольцаў шчыра адгукнуліся на заклік савецкае ўлады аб узмацненьні хлебазагатовак. Мабілізаваны ўвесь камсамольскі актыў. Камсамольцы-гаспадары першымі здалі лішкі хлеба.

АРЫШТ СПЭКУЛЯНТАЎ.

ЗАПАРОЖЖА, 12-I. За зрыў хлебазагатовак і перавышэньне канвэцыйных цэн ДПУ арыштавала 11 спэкулянтаў хлебам.

* * *

МАРЫУПАЛЬ, 12-I. ДПУ арыштавала групу прыватнікаў, якія зрываюць хлебазагатоўкі і скупліваюць збожжа ў сялян па павялічаных цэнах.

СТАН ЗАГАТОВАК У СІБІРУ.

НОВАСІБІРСК, 11-I. За апошнюю дэкаду сьнежня ўзровень хлебазагатовак на ўсходніх раёнах Сібіру заставаўся амаль на ўзроўні загатовак другое дэкады. У заходніх акругах Сібіру колькасьць загатаванага хлеба зьменшылася.

У агульным па Сібіру за трэцюю дэкаду загатавана 2.840 тысяч пудоў, замест 3.370 тысяч пуд. за ранейшыя. Прычынак у загатоўках зьвязан між іншым з пашырэньнем іншых больш выгодных з камэрцыйнага пункту гледжаньня загатовак. У некаторых раёнах праца вялася вельмі слаба. Між тым, наліччa хлеба ў сялян цалкам забясьпечвае выкананьне загатоўчых плянаў.

ПАЗЫКА ЎМАЦАВАНЬНЯ СЯЛЯНСКАЕ ГАСПАД.

УРАДАВАЯ КАМІСІЯ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ.

МАСКВА, 11-I. У інтарэсах пасьпешнага разьмеркаваньня «пазыкі ўмацаваньня сялянскае гаспадаркі» і мабілізацыі грамадзкае думкі навакол гэтае кампаніі, прэзыдыум ЦВК Саюзу прызнаў мэтазгодным арганізаваць часовую ўсесаюзную камісію спрыяньня рэалізацыі пазыкі пры прэзыдыуме ЦВК Саюзу пад старшынствам Пахомава.

ЯК БУДЗЕ РАЗЫГРЫВАЦЦА ПАЗЫКА.

МАСКВА, 11-I. Рассьпка пазыкі ўмацаваньня сялянскае гаспадаркі будзе рабіцца з такім разрахункам, каб кожная сэрыя пазыкі была разьмеркавана ў пэўным раёне. З гэтае прычыны, што выйгрышы разыгрываюцца па кожнай сэрыі пазыкі, дык, значыць, яны дастануцца трымальцам пазыкі, якія жывуць у даным раёне.

Гэта зробіць выйгрыш больш цікавым для сялянства. Адначасна будзе ўстаноўлена сыстэма раённых тыражоў. Да гэтае пары, нават у тых выпадках, калі выйгрышы назначаліся па сэрыях (напрыклад, па 3-й сялянскай пазыцы), розыгрыш праводзіўся адной выгражной камісіяй. Па пазыцы ўмацаваньня сялянскае гаспадаркі тыраж будзе праводзіцца ў кожным раёне, дзе разьмеркаваны адна ці некалькі сэрый. У склад кожнае з раённых тыражных камісій будуць уведзены прадстаўнікі мясцовых сялян-трымальцаў облігацый тае сэрыі, выйгрышы па якой разыгрываюцца.

ПРЫКЛАДНОЕ СКАРЫСТАНЬНЕ ВЫЙГРЫШУ.

ТОМСК, 11-I. Селянін Карнілаў выйграўшы ў тыражы 2-е сялянскае пазыкі тысячу руб., на 500 руб. купіў сэртыфікатаў, па 250 руб.—пазыкі індустрыялізацыі і 250 руб. паклаў на бягучы рахунак для пабяцыця аблігацый чарговых пазык.

УДЗЕЛ ЖАНЧЫНЫ Ў СЬВЯЦЕ АБАРОНЫ.

МАСКВА. Аддзел ЦК па працы сярод работніц і сялянак зьвярнуўся да ўсіх мясцовых аддзелаў са спэцыяльным лістом аб удзеле работніц і сялянак у правядзеньні сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя Чырвонае арміі. У лісьце зазначаецца, што падрыхтоўка да сьвяткаваньня на мясцох павінна праводзіцца пад лёзунгам мясавага ўцягненьня працоўных жанчын у практычную працу вайсковых гурткоў.

Да дню сьвяткаваньня неабходна прывурочыць адчыненьне курсаў сувязі, камандпазведчык ў і арганізацыю жаночых страхавых выпярэдніцтваў. Апрача таго, аддзелам работніц і сялянак даецца парада ў гэты дзень ушанаваць найбольш актыўных жанчын - слухачоў вайсковых гурткоў, а таксама выявіць удзельніц у грамадзянскай вайне якіх прыцягнуць да выступленьняў з успамінамі на сходах работніц, сялянак і хатніх гаспадынь.

Ужо на 7-мігадзінны дзень.

ЛЕНІНГРАД, 11-I. Фабрыка па выробе картону, у якой працуе 900 рабочых, кіруемых, як калектыў беспрацоўных, з 9-га студзеня пераведзена на 7-мігадзінны рабочы дзень.

Сьледзтва па справе забойцаў італьянскага віцэ-консула.

АДЭСА, 10-I. Акруговы пракурор Штэйнбэргскі паведаміў карэспандэнтаў РАТАЎ, што сьледзтва па справе аб забойстве італьянскага віцэ-консула Котые канчаецца. Сьледчым органам удалося выкрыць, пры якіх варунках зробілася злачынства. Затрыманым па гэтай справе і прызнаўшым сваю віну Дабравольскаму і Гуковічу высунута абвінавачаньне па п. 3-му 174 арт. Крымінальнага Кодэксу, караючаму за разбой, вынікам якога была сьмерць, аж да вышэйшае меры сацыяльнае абароны. Адказнасьць злачынства павялічваецца яшчэ больш па олькі ахвярэю разбою быў віцэконсул чужаземнае дзяржавы.

Горкаўская выстаўка ў Ніжнім.

НІЖНІ-НОЎГАРАД, 11-I. Адчыніўся выстаўка, прысьвечаная Максіму Горкаму. Матэрыялы дастаўлены шмат-якімі ўстановамі і асобамі вывучаючымі жыцьцё і творчасьць слаўутага пісьменьніка. Выстаўка пачынаецца з мэтрычнае кнігі. Далей ідзе малюнак дому, дзе пісьменьнік жыў у дзяцінстве і падбор відаў Ніжняга, якія спаміналіся ва ўласнаспасьніцкіх творах Горкага. Наступны эпізод выстаўкі-знаёмства з людзьмі „Дна"—начлежны дом з Бугровым на ганку і натоўпам „апекаемых" із начлежнікаў; Мілённая вуліца, васёлы, п'яны натоўп, тып грузчыкаў і валацуг, выканаяны ў Ніжнім мастаком Ювонам. Побач з гэтым рэвалюцыйныя пратесты Горкага, подапітчна запісаныя ў пратаколе ў справах жандарскае ўправы. Далей—першыя зборнікі апавяданьняў расходзіцца на ўзласнаспасьніцкіх творах Горкага. Наступны эпізод выстаўкі-знаёмства з людзьмі „Дна"—начлежны дом з

Павялічэньне дапамог па беспрацоўі.

МАСКВА Саюзны савет сацыяльнага страхаваньня зацьвердзіў новую норму месячных дапамог па беспрацоўі. У першым поясе па першай катэгорыі вызначаецца стаўка ў 27 р., па другой катэгорыі 20 р. і па трэцяй—16 р. 50 к., у 2-м поясе—24 р., 18 р. і 14 р. 50 к., у 3-м поясе—20 р., 15 р. і 11 р. 50 к., у 4-м поясе—17 р. 30 к., 13 р. і 10 р. 30 к., у 5-м поясе—15 р., 11 р. і 7 р. 50 к., у 6-м поясе—12 р., 9 р. і 7 р.

Новыя нормы набываюць моц з 1-га студзеня 1928 году.

Літаратурная сэкцыя пры „ВОКС'е".

МАСКВА, 11-I. Ва Ўсесаюзным Таварыстве Культурнае Сувязі з заграніцаю адбыўся сход ініцыятыўнае групы пісьменьнікаў і навукоў для заснаваньня літаратурнае сэкцыі пры Таварыстве. Сход выказаўся за заснаваньне савету сэкцыі пры таварыстве і паміцію прыцягнуць да ўдзелу ў працы гэтага савету шэраг літаратурных арганізацый.

Абсьледваньне стану ўраджайнасьці.

МАСКВА, 11-I. НК РСІ СССР намячае правесьці ўсесаюзнае абсьледваньне для праверкі інтэнсыўнасьці ажыцьцяўленьня перапрыемстваў савецкіх органаў па ўзьвышэньні ўраджайнасьці. Абсьледваньне выявіць сучаснае становішча і дынаміку ўраджайнасьці асноўных культур па некаторых раёнах (Украіна, Паўночны Каўказ, Беларусь, Саратаўскі раён, Урал, Кастрамскі і, магчыма, іншыя раёны). У кожным раёне абсьледваньне закране 2-3 асноўныя для данага раёну культуры.

Абсьледваньне выявіць таксама дадзеныя дасьледчых устаноў СССР па павялічэньні ўраджайнасьці і скарыстаньні гэтых дасягненьняў у сялянскіх гаспадарках.

Праўда францускіх рабочых аб СССР.

СПРАВАЗДАЧЫ ФРАНЦУСКАЕ ДЭЛЕГАЦЫІ.

ПАРЫЖ, 10-I. У памяшканьні муніцыпалітэту Сэн-Дэні (рабочы прыгарод Парыжу) адбыўся сход рабочых, на якім удзельнікі дэлегацыі на кастрычнікавых сьвятах у СССР падзяліліся ўражаньнямі аб падарожжы. Адказваючы на прывітаньне Барбэ, генэральнага сэкратара францускага камсамолу, толькі папярэдзіўшы вызначнага з астрогу, Гібарыба (сацыяліст, член дэлегацыі) заявіў, што, пераканаўшыся ў агідасьці анты-савецкае кампаніі, дэлегаты ўсюды і ўсямерна будуць растлумачваць працоўным вялізарныя посьпехі, дасягнутыя расейскай рэвалюцыяй.

ПАРЫЖ, 11-I. Водгук паведамленьняў «Юманітэ», Ліварэля і Калёнэр выступалі ў Парыжы з дакладам аб падарожжы францускае кастрычнікавае дэлегацыі ў СССР. Сацыялісты спрабавалі палемізаваць з дакладчыкамі, але няўдала.

Дэманстрацыя фільму, на якім былі зьняты кастрычнікавыя ўрачыстасьці ў Маскве, была забаронена ўладаю нібы з прычыны таго, што фільм не прайшоў праз цэнзуру.

Уся ўвага загатоўцы хлеба і сыравіны.

КУЛАК, СПЭКУЛЯНТ, РАЗГІЛЬДЗЯЙ—НАШЫ ВОРАГІ НА ЗАГАТОЎЧЫМ ФРОНЦЕ.

У БССР трэба загатовіць 2,500.000 пуд. хлеба.

Загатоўчыя арганізацыі дагэтуль аддавалі мала ўвагі хлебазагатоўкам.—Адна Случчына ў старыя часы выкідвала на рынак да 1.000 000 пудоў хлеба.—Хлебныя лішкі ёсьць і ў іншых мясцох БССР.—Нар. Кам. Гандлю прымае шэраг мер да ўзмацненьня загатовак.—Сяляне просяць пашырыць барацьбу з самагоншчыкамі.

ЗАГАТОЎКА ХЛЕБА І СЫРАВІНЫ ПРАХОДЗІЦЬ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА.

(Гутарка з Нар. Клм. Гандлю БССР тав. Адамайцісам).

Хоць БССР па хлебу і зьяўляецца дэфіцытнай краінай, але па паасобных акругах і райёнах бязумоўна ёсьць хлебныя лішкі. Усім нам досыць добра вядома, што райёны б. Случкага павету ў старыя часы былі жытніцай Беларусі і ў самыя цяжкія моманты давалі вялікую колькасьць—прыблізна да 1.000.000 пудоў розных збожжавых прадуктаў.

Таксама хлебныя лішкі бывалі і ёсьць зараз у некаторых раёнах Гомельшчыны, Бабруйшчыны, Магілёўшчыны, Меншчыны і нават Аршаншчыны (Амсьціслаў), і таму зацьверджаны ўрадам плян загатовак па БССР—2.500.000 пуд. хлеба—бязумоўна на зьяўляецца рэальным плянам і можа быць поўнасьцю ажыцьцёўлены.

Аднак, хлебазагатоўчыя арганізацыі, як «Хлебапрадукт», спажывецкая каапэрацыя і сел.-гас. каапэрацыя, ня выявілі належнай увагі на мясцовыя загатоўкі хлеба, а ўсю сваю ўвагу зьвярнулі на завоз хлеба з-за межаў БССР. Даволі сказаць, што нават райёны б. Случкай акругі бязупынна патрабуюць завозу хлебапрадуктаў.

З прычыны гэтага мясцовыя хлебныя рэсурсы не скарыстоўваліся і заставаліся на мясцох, пападаючы пераважна ў рукі прыватных скупшчыкаў. Нават былі выпадкі, калі хлеб купляўся ня толькі прыватнымі скупшчыкамі, а і кулакамі для таго, каб яго захаваць на выпадак росту цэн і потым на гэтым спэкульнуць.

Вось чаму асабліва сур'ёзную ўвагу трэба зьвярнуць мясцовым загатоўцам на загатоўкі па мясцох. У тых выпадках, калі каапэрацыя адводзіць гэтаму вельмі важнаму пытаньню належную ўвагу, мы маем і добрыя вынікі. Напрыклад, у Хойніках, Гомельскай акругі, каапэрацыя за вельмі кароткі час загатовіла 4500 пуд. хлеба.

На лініі фінансавых органаў прымаецца шэраг мер да свачасовага паступленьня налічанага падатку, страхавых плацяжоў і інш. Гэтыя мерапрыемствы павінны выклікаць рост паступленьня хлеба.

Неабходна таксама зьвярнуць асаблівую ўвагу на надзвычайна небясьпечнае зьявішча, як узмацненьне выгалкі самогону. З месц паведамляюць, што самагонакурэньне значна ўзмацнецца, а барацьба з гэтым злом аслабела.

Досыць яскрава абгетым гаворыць той факт, што дэлегаты Ўсебеларускага Зьезду сялян-літоўцаў з Тамашэўскага райёну прывезлі наказы і, паміж іншым, у апошніх маюцца пункты, патрабуючыя ад савецкай улады мерапрыемстваў да ўзмацненьня барацьбы з самагонакурэньнем. Самі сяляне бачаць, што самагонакурэньне зьнішчае шмат хлеба, такія-ж наказы былі ад сялян і іншых месц.

На гэта неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу мясцовым органам улады і павесьці рашучую барацьбу.

У сувязі з узмацненьнем на хлебным рынку дзейнасьці прыватнікаў, Нар. Кам. Гандлю прымае шэраг мер, да ўвядзеньня апошніх у такое лагво, каб яны не перашкаджалі дзяржаўным арганізацыям. У адносінах загатоўкі сыравіны трэба падкрэсьліць, што паступленьне л ё н у за 1-ы квартал прайшло нездавальняюча—плян выкананы прыкладна на 80 проц. У гэтых адносінах неабходна разгарнуць кампанію нашым загатоўчым арганізацыям. Нар. Кам. Гандлю прымае меры да больш поўнага насычэньня тавараамі і хлебам райёнаў, якія здаюць лён. Пры гэтым будуць прыняты меры, каб сяляне, якія здаюць лён, забясьпечваліся на гэтую-ж суму таварамі і хлебам.

Што-ж датычыцца загатовак іншых відаў сыравіны, то ня ўсюды загатоўчыя арганізацыі ў належнай меры раскачаліся.

У той час, калі ў некаторых раёнах загатоўка праходзіць інтэнсыўна (Бабруйскі акр. спаж. саюз), у Гомелі і Віцебску акрсельсаюзы гэтую працу праводзяць зусім вяла. Па вестках, пізавая сетка с.-г. каапэрацыі Віцебшчыны ня мае канкрэтных заданьняў і ўказаньняў ад свайго акрсельсаюзу аб загатоўцы сыравіны.

Для ліквідацыі гэтых недахопаў неабходна дысцыплінаваць загатоўчы апарат—зьнішчыць усе дэфэкты гэтага апарату. Усиляная валакіта на мясцох адаб'ецца на загатоўках.

Дзеля паладжваньня загатовак і зьнішчэньня маючых месца недахопаў, па месцы выехалі адказныя працаўнікі.

Тыя арганізацыі, якія ў загатоўках выявяць большую ініцыятыву, будуць лепш забясьпечвацца дэфіцытнымі таварамі, а з тымі арганізацыямі, што бязьдзейнічаюць і разводзяць валакіту, будзе весьціся ўзмоцненая барацьба.

Захады да ўзмацненьня загатовак.

Праўленьне Белсельсаюзу дало шэраг дырэктыў у ляняводныя райёны аб узмацненьні тэмпу загатовак. Запрапанована акрсельсаюзам разьмяркаваць паміж райёнамі недазкананы плян па загатоўках, уся адказнасьць за выкананьне ўскладаецца на старшынь праўленьняў сельсна-гаспадарчых крэдытных таварыстваў.

Разам з тым запрапанована ўсім акрсельсаюзам прыняць самыя рашучыя меры да здачы нізазымі аб'яднаньнямі ўсяго захатрахтазанага лёну-валакна і насеньня лёну. Побач з гэтым Белсельсаюз даў дырэктывы аб узмацненьні загатоўкі хлеба-фуражу і бульбы.

ЗАГАТОЎКІ СКУРАНОЙ СЫРАВІНЫ.

У першым квартале 1927-28 году загатоўлена 62000 буйных скур, а трэба было загатовіць 92000.

Дробных скур загатоўлена 74000 шт., а па пляну прадугледжвалася загатовіць 96000.

Згодна пляну, у 1927-28 гаспадарчым годзе мяркуецца загатовіць 230000 буйных і 800000 дробных скур.

ЯК ІДЗЕ ЗАГАТОЎКА ЛЁНУ.

Паводле папярэдніх данных, у 1-м квартале 1927-28 году па БССР загатоўлена 2293 тоны лёну, што складае 80 проц. плянавага заданьня. За год, згодна пляну, мяркуецца загатовіць лёну 8190 тон.

Шыльдавыя хлебазагатоўцы.

Старшыня сельска-гаспадарчага таварыства Шчыгел і старшыня спажывецкага таварыства Грузд — блізкія прыяцелі. Абодвы яны ярыя прыхільнікі каапэрацыі, абодвы вельмі часта выступаюць супольна на сходах і падтрымліваюць адзін другога, а па сьвятах за сталом абавязкова п'юць за каапэрацыю наогул і за спажывецкую і сельска-гаспадарчую асабліва.

Абодвы яны лічацца перадавікамі, выпісваюць газэту, разам чытаюць яе і разам-жа лаюць чэмбэрлеваў і савецкіх галавацяпаў. Так ідзе да таго часу, пакуль у газэтах зьяўляецца абежнік аб хлебазагатоўках.

Прачытаўшы абежнік, Грузд выклікае прыказчыка і загадвае яму не пазьней заўтрашняга дню арганізаваць ссыпны пункт каля самае ваколіцы вёскі, каб усім уяжджаючым у вёску кідаўся ў вочы ссыпны пункт спажывецкае каапэрацыі.

На другі дзень Шчыгел доўга стаіць каля новага ссыпнога пункту спажывецкае каапэрацыі, задумепна круціць галавой, а праз паўгадзіны вясковы сталяр Тодар з надручным будуць часовы сьвіран за спажывецкім ссыпным пунктам.

Грузд на другі дзень прыходзіць на ссыпны пункт і зьдзіўлена агляда́е побач з ссыпным пунктам сьвіран: шыльда сьвірну бязумоўна заслане сабою шыльду ссыпнога пункту. Грузд загадвае: неадкладна перанесьці ссыпны пункт за сьвіран сельска-гаспадарчага таварыства.

Праз паўгадзіны Шчыгел, лаючы і і праклінаючы спажывецкую каапэрацыю і Грузда, між іншым, загадвае Тодару спыніць пабудову і перанесьці яе за груздаўскі ссыпны пункт.

Грузд моўчкі глядзіць на працу Тодара і чырванеючы награжае кулаком Шчыглу. Шчыгел моўчкі ўсьміхаецца. Уночы Грузд з прыказчыкам, ціха брэнькаючы пілами і лапатамі, ламаюць свой ссыпны пункт і пераносяць яго за шчыглаўскі сьвіран і заваленыя ідуць спаць. На золаку даваколіцы прасоўваюцца тры фігуры, і сонца застае іх забіваючымі цьвікі ў шыльд шчыглоўскага сьвірну, які зноў апынуўся напераадзе груздаўскага ссыпнога пункту.

Усе наступныя тры дні ў Грузда і Шчыгла займае чэрэдаска ссыпнога пункту і сьвірна. Нарэшце на шостым дзень Грузд ідзе на ўступкі і будуе свой ссыпны пункт насупроць шчыглаўскага сьвірна. Шчыгел моўчкі згаджаецца.

Пасьля гэтага Грузд і Шчыгел, моўчкі і люта пазіраючы адзін на другога, ідуць паглядзець, як выглядае з дарогі сьвіран і пункт. Грузду здаецца, што яго шыльд бязумоўна больш ды яшчэ і прыгажэй шчыглоўскага, а Шчыгел радасна ўсьміхаецца: перш за ўсё кідаецца ў вочы яго сьвіран з чырвоным плякатам.

Моўчкі варочаюцца яны ў сяло і пачынаюць прымаць хлеб ад даўно прыехаўшых сялян, якія лаюць ва ўсю іх продкаў аж да сёмага пакаленьня.

Праз гадзіну сяляне, спаганяючы злосьць на конях, вязуць хлеб дамоў.

У гэты-ж час Грузд напірае з кулакамі на прыказчыка і лае яго за тое, што той за чатыры дні ня мог прывезьці тавару з гораду і цяпер паліцы ў крамах пустыя. А Шчыгел піша ліст у акругу у якім ласцца, што забыўся напомніць, што яму патрэбны грошы для расплаты з сялянамі за здадзены імі хлеб.

П. Б.

Маленькі фэльетон.

„З НОВЫМ РІКАМІ"

«Па ўсёй Беларусі, нейкім невядомым чынам, замест беларускіх, — распаўсюджаны ў большасьці украінскія календары».

(Ціхае паведамленьне з гаэт).

Лянівы мы народ...
Любім мы склаўшы рукі пасядзець...
...І каб цішыня была...
Ды каб ніхто з боку не перашкаджаў...
Нездарма адзін мой зямляк казаў, —хацэў бы я, казаў, знайсьці такую пасаду, на якой Янка працуе,—пакуль яшчэ, кажа, заўважаць, што нічога не раблю, з паўгода напрацаваў бы!

А украінцы,—яны хітрыя!
Ім Шэўчэнка даў «запавід»—«думайце браты маі»!.
А яны, хітрыя,—думаюць!...
Нас, праўда, на гэткія хітрыкі ня возьмеш.
Бо, калі я сказаў аднойчы Шэўчэнкаўскі «запавід», маім землякам:
— Думайце, сказаў, землякі!...
Дык яны:
— Нас, кажуць, шэўчэнкаўскі «запавід» не датычыцца... Няма, кажуць, у цябе нацыянальнай сьвядомасьці...
— Што ж нас тагды датычыцца,—чырванеючы перапытаўся я.
А яны, як Дыген, калісьці:
— Атыйдзіся, кажуць, ад сонца! Не перашкаджай, кажуць «яблачка» сьпяваць будзем... І—эх, кажуць, лоўкая песьня...
...А тым часам украінцы ўсю Беларусь украінскімі календарамі і запоўнілі, ды з першай старонкі яшчэ і кпяць:
— З новым рікам!—пішуць вам.
— З 1-ым січнем!...
Шчасьця, кажуць, вам,—долі!.. 1000 гадоў, кажуць, вам жыць, ды каб мы яшчэ ня раз вас «з новым рікам» віталі!.. . . . . .
. . . . . .
. . . . . .
Мне б разам з другімі, падумаўшы, пратэставаць бы цяпер, бо ў нас ёсьць і свае беларускія календары, але мяне на гэткія хітрыкі ўжо ня возьмеш.
Нацыянальная сьвядомасьць і ў мяне ўзрасла. .
— Атыйдзіся, хлопцы, «яблачка» сьпяваць буду.
І—эх, лоўкая песьня!

Алёша.

Судова-сьледчы апарат рацыяналізуецца.

РАБОТНІКІ З МЕСЦ ЗГАДЖАЮЦЦА З АСНОЎНЫМІ МОМАНТАМІ ПРАЭКТУ НК РСІ.

Што дасьць увядзеньне сельскіх судоў.

Нарсудзьдзя 1-га вучастку гор. Менску, тав. Сакалоў, не згаджаецца з тым, каб органы сьледзтва вызначалі тэрміны слуханьня спраў у нарсудох. Па яго думцы, гэта ўнясе ў судавытворчасьць шмат труднасьцяў і выкліча ў выніку яшчэ большую загружанасьць нарсудоў.

Адносна арганізацыі сельскіх судоў тав. Сакалоў поўнасьцю згаджаецца з думкамі па гэтым пытаньні, высунутымі тав. Гінзбургам на папярэднім пасяджэньні. Няжыцьцёвасьць гэтых судоў ён тлумачыць адсутнасьцю кваліфікаваных судовых працаўнікоў на мясцох.

— Па гэтай прычыне,—кажа тав. Сакалоў,—суды на вёсцы нічога нам не дадуць, а аўтарытэт суду будуць падрываць, бо там вы будзеце мець і сватаўство, і кумаўство, і пратэкцыянізм.

Прадстаўнік НК РСІ, тав. Ракаў, растлумачыў пасьля выступленьня тав. Сакалова, што прамоўцы не разумеюць дэтальна той пастановкі працы сельскіх судоў, якую мяркуе зрабіць РСІ. Гэтыя суды, па праэкту НК РСІ, маюць разьбіраць выключна грамадзянскія справы, якія не перавышаюць 15 руб.

Пракуроры—грамадзкія выхаваўцы

Член вярхоўнага суду на крымінальным аддзеле тав. Канакоцін, спыніўся на пытаньні перабудовы інстытуту абароны на калектыўных асновах. Да гэтага часу, па яго думцы, абарона існавала на індывідуальных прынцыпах.

— Сельскія суды,—кажа т. Канакоцін,—у такім выглядзе, у якім яны прапануюцца, будуць няжыцьцёвыя. Тыя функцыі, якія мяркуецца перадаць сельскім судам, трэба перадаць сельскаму адміністрацыйнаму органу, які і будзе вырашаць спрэчныя сялянскія справы ў адміністрацыйным парадку.

Неабходна пашырыць падсуднасьць Нарсуду, перавёўшы, такім чынам, значную частку спраў з Акрсудоў у Нарсуды і пакінуць у кампэтэнцыі першых крымінальныя справы і тыя грамадзянскія, у якіх закранаюцца не інтарэсы асоб, а сыстэма.

Вучастковыя пракуроры ў большасьці не адпавядаюць свайму назначэньню—ня могуць весьці спрод насьленьня грамадзкай працы. Гэта падобра. Вучастковыя пракуроры павінны быць грамадзкімі выхаваўцамі.

Настаў час пераканструктаваць спраўдамы.

У спрэчках прыняў удзел пракурор Менскай акругі тав. Лійц, які зазначыў, што праца сьледчых органоў павінна быць набліжана да працы міліцыі.

— Гэта справа,—кажа т. Лійц,—частка праводзіцца практычна ў Менскай акрузе і дае добрыя вынікі.

Тут шмат гаварылі аб сельскіх судох, аб набліжэньні суду да сялянскіх мас, а ніхто не гаварыў аб бюракратызьме і валакіце ў вырашэньні зямельных спраў. Гэта пытаньне для сялянства самае важнае, і яго неабходна упарадкаваць побач з агульнай рацыяналізацыяй судова-сьледчай справы.

Я закрану яшчэ адно досыць важнае пытаньне, аб якім па мінулым нашым пасяджэньні даў намёк т. Якубчык. Я закрану пытаньне аб папраўчых домах. Мне здаецца, што настаў час фундамантальна пераканструктаваць нашы папраўчыя дамы. Нам трэба арганізаваць асобны від прымусовага інтэрнату і зьмяшчаць у яго тых асуджаных, якія не зьяўляюцца небясьпечнымі для грамады, над судом першы раз, выпадкова зрабілі злачынства, як рабочыя сялянская беднота і інш. Адным словам, гэты інтэрнат павінен служыць для тых асуджаных, якіх нам важна захаваць ад псаваньня пад уплывам небясьпечнага элемэнту ў папраўчым доме, пад уплывам тых, якія ўпарта парушаюць нашу рэвалюцыйную законнасьць, якіх мы пакуль што прымушаны трымаць пад замкамі і за кратамі.

Саветы—органы дыктатуры пралетарыяту.

— На мінулым пасяджэньні,—кажа т. Феўралёў, нарсудзьдзя 2 вуч. г. Менску,—была гутарка аб тым, што сельскія суды будуць не клясавымі, а сялянскімі. Інакш кажучы, яны ня будуць прытрымлівацца пралетарскае ідэалёгіі. Я рашуча з гэтым буду спрачацца. Сельскія саветы—органы дыктатуры пралетарыяту, і нам няма чаго баяцца, даручаючы ім разьбіраць на месцы некаторыя дробныя спрэчныя сялянскія справы.

Сельскія суды мы можам назваць ня судамі, а якімі-небудзь камісіямі—гэта ня мае па сутнасьці ніякага значэньня: факт застаецца фактам. Арганізацыя сельскіх судовых органаў неабходна і яна дасьць адпаведную карысьць, разгрузіўшы ад спраў нарсуды.

Працаўнікі міліцыі яшчэ ня могуць належным чынам спраўляцца са сьледзтвам, якое, на мой погляд, міліцыі даручаць зарана.

Цэнтральнае аб'яднаньне абаронцаў непатрэбна.

Ад імя Менскай акруговай калегіі абаронцаў выступіў т. Васкабойнікаў, які зазначыў што ўсебеларускае аб'яднаньне абаронцаў—цэнтральная калегія—орган зусім непатрэбны.

— На тыя сродкі, якія мы выдаём на гэты орган, мы можам арганізаваць цэлы шэраг выездаў юрыстаў з райёнаў на сяло, рабіць у хатах-чытальнях карысныя для сялянства лекцыі і інш.

Па гэтым-жа пытаньні выступаў і праваабаронца т. Сідлярэўскі, які, наадварот, даводзіў ня толькі няшкодпасьць існаваньня цэнтральнага аб'яднаньня абаронцаў, а нават карысьць.

Ці патрэбны сьледчыя.

— Тут шмат спрачаліся, — кажа сьледчы т. Яшумаў,—аб карыснасьці і некарыснасьці існаваньня органаў сьледзтва. Большасьць выказвалася за тое, што сьледчыя ўжо непатрэбны. Пры гэтым прыводзіліся факты са страўнікамі, пячонкамі і інш. Гэтыя факты, калі і калі месца, не зьяўляюцца прыкладам сьледчае валакіты, а, наадварот, зьяўляюцца прыкладам умелага выкананьня сьледзтва.

Гаварыць пра тое, што ўжо настаў час ліквідаваць ораны сьледзтва, ня прыходзіцца—гэта абсурд. Нам трэба абмеркаваць пытаньне аб разгрузцы сьледчых, аб тым, каб ім даць магчымасьць працаваць, а тады ўжо гаварыць, ці выканалі яны свае абавязкі, ці не. Пакуль што сьледчыя працуюць у абставінах, якія нельга назваць здаровымі.

Ад сьледчых трэба забраць і перадаць міліцыі справы па тых артыкулах нашых кодэксаў, па якіх міліцыя на месцы злачынства амаль, а часам і зусім, канчае сьледзтва. Тады сьледчыя будуць разгружаны і змогуць добра працаваць.

Не скараціць, а пашырыць інстытут судовых выканаўцаў.

Судовы выканаўца, тав. Пэнкратаў, зазначыў, што ў працягу апошніх год ён выканаў 100 прыгавораў у горадзе і дапамогу міліцыі ўжываў толькі тры разы. Будучы на раёне, працаваў тры гады, а міліцыянэра выклікаў толькі адзін раз.

— Усе закіды,—кажа т. Пэнкратаў, —якія нам рабілі на нарадзе прадстаўнікі міліцыі, зьяўляюцца паклёпам.

Сельска-гаспадарчыя курсы.

У досыць глухой вёсцы Крапіўная нядаўна скончылі працу кароткатэрміновыя с.-г. курсы. На курсы запісалася 65 чал. Курсы праходзілі пры вялікай актыўнасьці і зацікаўленасьці сялянства.

На зачыненьні курсаў, калі аграном запытаўся: «ну як, дзядзькі, будзем што-небудзь рабіць новае ў сваёй гаспадарцы?» —дзядок гадоў 70 адказвае: Хіба жыў ня буду, а буракоў пасаджу. Другі кажа, многаполку абавязкова завядзём; усе паўтараюць: абавязкова завядзём.

І можна паверыць, што зробяць, бо цяга да культурнага гаспадараньня ёсьць. Калі прывезьлі трыер на курсы, то амаль кожны гаспадар пасеньне прачысьціў.

У. К-ос.

Бярэзінскі р., Меншчына.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Машына праклала дарогу ў вёску.

Бабруйск. Попыт на сельска-гаспадарчыя машыны з боку сялянства сёлета зазначаўся ніжэйшы, чым летась. Гэта тлумачыцца, што буйныя машыны ў значнай ч[illegible] колькасьці закупіліся ў мінулым годзе заможным сялянствам, на што апошняму адпускаўся крэдыт. На працягу-ж 1927 году гэты крэдыт для заможных гаспадарак быў зачынен і буйныя машыны купіліся выключна бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі і калектыўнымі аб'яднаньнямі.

Разгляваючы тэмп прасоўваньня ў вёску сельска-гаспадарчых машын, мы бачым, што болей за ўсё іх е на вёску сячкарня-саламарэзка. За 1927 год гэтых машын прададзена 1369 шт. супроць 946, што былі прададзены ў 1926 годзе. Саламарэзка стала неабходнаю машынаю бядняцкай гаспадаркі.

Назіраўся значны попыт у мінулым 1927 годзе на сэпаратары. У 1926 годзе іх было прададзена вельмі нязначная колькасьць, у 1927 годзе іх прададзена 146. Значная колькасьць гэтых сэпаратараў пайшла ў бядняцкія і серадняцкія гаспадаркі. Гэта гаворыць аб тым, што сялянства імкнецца да паладжаньня машынай апрацоўкі малака.

Трэба сказаць, што забясьпечваньне акругі буйнымі сельска-гаспадарчымі машынамі здавальняючае. На акрузе працуе 21 трактар.

Павялічыўся супроць 1926 году і продаж сеялак, спрушывных бароН. Апошнія, падобна сячкарні, шырка прасоўваюцца ў сялянскія гушчы. Толькі за 1927 год іх прададзена 300 штук.

Сярод болей ходкіх сельгаспадарчых машын трэба адзначыць веялкі, малатаркі і прывады да іх.

Усяго за 1927 год па акруговых установах апрача пізавой сеткі, прададзена сельска-гаспадарчых машын на 231 тысячу рублёў. Апрача таго, па пізавой сеці машын прададзена на 164 тысячы.

У значнай меры спрыяе прасоўваньню машыны ў вёску сельска-гаспадарчы крэдыт. За 1927 год крэдыту на зялёбыцьцё сельска-гаспадарчых машын было адпушчана 205170 руб. У параўнаньні з мінулым годам сума крэдытаў на гэтай галіне павялічылася на 30-40 проц. Крэдыты выдаваліся у першую чаргу земляўпарадкаванаму, каапераванаму і бядняцкаму сялянству.

Вывад з усяго вышэйсказанага можа быць толькі такі: машына праклала сабе буйную дарогу на вёску, сял

Вынікі працы Горнага Аддзелу ВСНГ.

ПРАЭКТЫ НОВЫХ ЗАВОДАЎ ПА АПРАЦОЎЦЫ МІНЭРАЛЬНЫХ БАГАЦЬЦЯЎ.—АРГАНІЗУЮЦЦА ЛЯБАРАТОРЫІ І МУЗЭЙ МІНЭРАЛЬНЫХ БАГАЦЬЦЯЎ.

На апошнім пасяджэньні прэзыдыум ВСНГБ заслухаў даклад інжэнэра тав. Розіна аб працы Горнага Аддзелу ВСНГБ за 1927 год.

Прэзыдыум адзначыў, што ў выніку дасьледчай працы на тэрыторыі БССР выяўлена наліччa вялікіх запасаў цэнтнага шэрагу карысных выкапняў. Дзякуючы добрай якасьці і выгаднаму месцу заляганьня, гэтыя багацьці могуць стаць моцнай базай для разьвіцьця некаторых галін прамысловасьці.

У Гомельшчыне праэктуецца пабудова новага буйнага мэханізаванага шкляного заводу. Дзякуючы таму, што завод мяркуецца пабудаваць у мясцовасьці багатай кварцавымі пяскамі, крэйдаю і іншымі выкапнямі, патрэбнымі для выпрацоўкі шкла, завод, пры максымальнай нагрузцы ў год 66 тысяч тон, можа мець запас сыравіны на 50 год. На гэты-ж тэрмін завод будзе забясьпечан і тарфяным апалам, які ёсьць недалёка ад заводу.

Праэкт заводу мае быць скончан у маі 1928 году, а ў студзені 1929 году адбудзецца закладка гэтага заводу.

Побач з гэтым, у раёне ст. Камунары на лініі Ворша-Унеча знойдзены крэйдавыя і гліністыя мэргелі для выпрацоўкі портлянд-цэманту (цэманту, які не баіцца вільгаці). У гэтым раёне вызначана пабудова цэмантнага заводу. Запас сырцу дасягае 2-х мілёнаў пудоў. Гэта дасьць магчымасьць забясьпечыць завод сырцом на 50 год.

Прэзыдыум ВСНГ запрапанаваў прамыслова-эканамічнай управе прыняць тэрміновыя меры да аховы і рацыянальнага выкарыстаньня выкапняў.

Шэрагам разьведачных досьледаў устаноўлена, што ў раёне ракі Прыпяці ёсьць значныя запасы добраякаснага торфу, а таксама выгодныя ўмовы для здабываньня і транспарту.

У плян працы на 1928 год пастаноўлена ўключыць цэлы шэраг работ па ўдасканаленьні працы Горнага Аддзелу ВСНГБ, важнейшыя з якіх наступныя:

прыступіць да арганізацыі лябараторыі па вывучэньні керамічнай вытворчасьці і да пабудовы дасьледчай станцыі па вывучэньні палівных выкапняў.

Прэзыдыум ВСНГ прызнаў неабходным арганізаваць геолёга-разьведчую экспэдыцыю па вывучэньні геолёгічнай пабудовы мінэральных багацьцяў у раёне дзейнасьці Асінастрою.

Побач з іншаю працаю Прам.-Экан. Управе даручана прыступіць да арганізацыі горна-прамысловага музэю.

IV-ты пленум Цэнтральнага К-ту Беларускага т-ва Чырвонага Крыжу.

Сёньня ў памяшканьні ЦК Чырвонага Крыжу (вул. Карла Маркса, 3) пачынаецца а 6 гадзіне ўвечары IV-ы пленум Цэнтральнага Камітэту. Пры сучасных варунках разгортваньня чырвона-крыжнай працы як сярод гарадзкога, так асабліва сярод вясковага насельніцтва праца пленуму павінна мець выдатнае значэньне. Пленум мае заслухаць і абгаварыць справаздачу бюро ЦК за апошні пэрыяд і спэцыяльна застанавіцца на пытаньні аб формах працы нізавых ячэек т-ва, санітарнай падрыхтоўцы насельніцтва і аб пашырэньні Чырвонага Крыжу на транспарце.

Трэба сказаць, што рабоча-сялянская маса надзвычайна энэргічна адгукнулася на заклік Чырвонага Крыжу да санітарнае асьветы: па прадпрыемствах, пры ўстановах, пры жыллятаварыствах і г. д.—заснавалася па БССР звыш 250 гурткоў першай дапамогі, у якіх бярэ ўдзел некалькі тысяч актывістаў Чырвонага Крыжу. Часта не хапае сродкаў і літаратуры, каб задаволіць гурткі ўсім патрэбным. Перакінулася гэта праца і па вёску, дзе ёй найбольш цікавіцца сялянская моладзь.

Чарговае заданьне Чырвонага Крыжу—гэта пашырэньне яго арганізацыі на транспарце і ў першую чаргу на чыгунцы. Чыгункі БССР маюць да 50000 рабочых і зьяўляецца абавязковым прыцягнуць да працы ў Чырвоным Крыжы хоць-бы 25 проц. гэтага ліку (гэткі процант ёсьць у Украінскім Чырвоным Крыжу). Фактычна-ж прыцягнута толькі каля 1½ тысячы.

Апрача таго, пленум павінен абгаварыць пытаньне аб перавыбарнай кампаніі ў бягучым годзе, што павінна аднавіць працу Чырвонага Крыжу на мясцох і акрэсьліць шляхі разьвіцьця на бліжэйшую будучыну.

А. Цьвікевіч.

Заўвагі да справаздач МЦРК.

Кожнаму савецкаму грамадзяніну добра вядома сыстома нашае каапэрацыі, яе напрамак і сутнасьць, а таксама мэты і задачы.

Значэньне савецкай каапэрацыі ў жыцьці нашае дзяржавы і савецкай грамадзкасьці характарызуецца нашай прэсай, дзе поруч з дасягненьнямі ў гэтай галіне вызначаюцца і хворыя адмоўныя бакі яе.

Само сабою зразумела, што перавага на станоўчых бакох, але ёсьць і недахопы, чым і тлумачыцца такая надзвычайная зацікаўленасьць гэтаю справаю ўсіх партыйных, савецкіх і прафэсыйных арганізацый.

Гэтая зацікаўленасьць, бязумоўна, павінна выражаць хібы, але поўнага зьвінчэньня іх можна будзе дасягнуць хутчэй, калі гэтаю справаю зацікавяцца ў належнай меры тыя, каго гэта непасрэдна датычыцца, г. з. пайшчыкі, якія фактычна зьяўляюцца гаспадаром каапэрацыі, а разам з гэтым павінны быць і будаўніком яе.

Прыходзіцца згадзіцца, што з гэтага боку да сучаснага моманту вынулена мала зацікаўленасьці.

Належыць прыпомніць справаздачныя сходы, якія рабіліся адзін раз у год, дый то толькі тады, калі было патрэбна правесьці перавыбары ўпаўнаважаных, сухасьць гэтых сходаў, часта слабое знаёмства з умовамі жыцьця і справамі каапэрацыі дакладчыкаў, рабіўшых па даручэньні праўленьня МЦРК справаздачу, дык стане зразумелым, што інакш і быць не магло, што добра і тое, што на гэтыя сходы наогул прыходзілі, хоць і ў пязначным ліку.

Мне здаецца, што ў гэтым годзе патрэбна зьвярнуць максымум увагі як на справаздачасьць МЦРК аб працы за мінулы год, так і на тое, каб агульныя сходы былі сапраўды агульнымі з належным лікам прысутных пайшчыкаў, і каб выбары ўпаўнаважаных ЦРК былі праведзены, як сьлед, з такім разрахункам, што выбарныя будуць не пачэснымі, а сапраўднымі працаўнікамі, будаўнікамі каапэрацыі.

Гэтага магчыма будзе дасягнуць пры ўмовах, калі будзе праведзена наступнае:

1) Праўленьню МЦРК павінна загадзя апавясьціць візавыя прафарганізацыі і дагаварыцца з імі, дзе і калі адбудуцца справаздачныя сходы. Прафарганізацыям абавязкова патрэбна правесьці падрыхтоўчую працу, каб на гэтыя сходы былі прыцягнуты ня толькі ўсе пайшчыкі, але і тыя сябры прафсаюзу, якія да гэтага часу ня лічацца ў шэрагах каапэрацыі.

2) Праўленьню МЦРК неабходна выдзеліць для справаздачы асоб, якія маглі-б даць сталы адказ на кожнае запытаньне, якое можа ўзьняцца ў сувязі са справаздачай на агульным сходзе, а таксама даць малюнак пэрспэктыў каапэрацыі на бліжэйшы час. Такімі компэтэнтнымі асобамі могуць быць сябры праўленьня і старшыня рэвкамісіі, якія прымаюць непасрэдны ўдзел у жыцьці і працы ЦРК, ведаюць гэтую справу ўздоўж і папярок, а ня маюць толькі з ёю знаёмства праз сухія лічбы бухгальтарскага балянсу.

3) Дагаварыцца з ЦП прафсаюзаў, каб тыя зрабілі прапанову сваім візавым прафарганізацыям правесьці даклады ўпаўнаважаных ЦРК, сяброў крамных і іншых каапэрацыйных камісій аб тым, што зроблена ў гэтай справе. На гэтых сходах пажадана вызначыць адпаведныя кандыдатуры, а таксама выказацца аб патрэбных зьменах у асабовым складзе кіруючага органу МЦРК.

4. Дагаварыцца на падрыхтоўчых сходах, як больш рацыянальна скарыстаць сродкі, вызначаныя МЦРК на каапэрацыйную асьвету.

І. Масюкевіч.

БЕДНЯКІ ЗЯМЛІ ЧАКАЮЦЬ—СЕЛЬСАВЕТ І НЯ ДБАЕ.

У весцы Гавядах, Таўкачоўскага сельсавету, быў запасны зямельны фонд. Гэты фонд быў разьмяркован старшынёй Таўкачоўскага сельсавету тав. Андросавым у кастрычніку 1926 г. паміж безьзямельнымі. Праэкт разьмеркаваньня быў зацьверджан раённай зямельн. камісіяй, але потым ён (праэкт) і пастанова зямельнай камісіі былі адменены акруговай зям. камісіяй, бо ня былі захованы некаторыя пункты закону. Справа зноў была перададзена Таўкачоўскаму с-с-ту ў красавіку 1927 г. для новага разьмеркаваньня. І вось гэта справа ляжыць у с-с. бяз руху і зараз. Гэтакая валакіта з боку сельсавету бязумоўна выкліча спрэчкі і суды паміж папярэдніх і новых землякарыстальнікаў, а ці павінна гэта быць. Беднякі-ж, чакаючы атрыманьня зямлі кажуць:

— Чаго-ж нашаму сельсавету сьпяшацца, ён моцны—сэкратар ужо 3 гады служыць, дык нічого і не баіцца, але-ж ці ня шкодзіць ён гэтым працы сельсавету.

Ю. Р.

Шклоўскі р., Магілеўшчына.

Хроніка.

Праўленьне Аўтадору БССР.

Учора, 12-І, адбылося першае арганізацыйнае пасяджэньне праўленьня Аўтадору БССР. Старшынёю праўленьня абраны т. СТАШЭЎСКІ, нам. старшыні—т. АРЛОЎ і адказным сэкратаром—т. А. ІВАНОЎ.

Праўленьнем намечан на бліжэйшы час плян працы, які будзе зацьверджан на бліжэйшым пасяджэньні савету Аўтадору, 15—І.

Адначасна арганізаваны АЎТАТРАКТАРНЫЯ, ШЛЯХАВЫЯ І ПАЛІТАСЬВЕТНЫЯ СЭКЦЫІ.

Праўленьне часова будзе працаваць,—Менск, вакзал МБВ чыгункі, дом. літ. 3, тэл. 380,—куды праўленьне просіць накіроўваць усю карэспандэцыю.

Частковая ліквідацыя коначнага руху.

На аб'яднаным пасяджэньні прэзыдыуму акрвыканкому і гарсавету пастаноўлена скараціць коначны рух па лініі—станцыя МБВ-Пляц Волі.

Коначны рух пакідаецца па лініі Пляц Волі-Пярэспа.

Гэта пастанова будзе ажыцьцёўлена тады, калі будуць атрыманы новыя аўтабусы і будзе пашыран аўтабусны рух. Прыблизьцё аўтабусаў чакаецца ў бліжэйшыя дні.

Срокі на крэдытаваньне сялянства.

Гэтымі днямі Белсельбанк разьмяркоўвае па акругах сродкі для крэдытаваньня сялянства: на набыцьцё рабочай жывёлы—200.000 руб., на машыны—280.000 руб., на рагатую жывёлу—100.000 руб. і 150.000 руб. на разьвіцьцё малочнай справы. Усе гэтыя крэдыты доўгатэрміновыя.

Даклады ўдзельнікаў пэдалёгічнага зьезду.

Гэтымі днямі вярнуліся з Масквы дэлегаты БССР на ўсесаюзны пэдалёгічны зьезд. У бліжэйшыя дні дэлегаты зробяць шэраг дакладаў аб працы зьезду для настаўнікаў і культурных працаўнікоў г. Менску.

Нацсклад вучняў у менскіх школах.

У менскіх школах сацыуху навучаецца 16568 чалавек дзяцей, з іх беларусаў—7316, яўрэяў—6873, палякаў—880, расейцаў—1226 і іншых—273.

Выпуск усебеларускіх курсаў батракоў.

Сёньня адбудзецца ўрачысты выпуск усебеларускіх курсаў прафактыву з батракоў. На курсах навучалася 47 чалавек. Курсанты будуць накіраваны на працу ў вёску.

У канцы студзеня будуць утвораны другія ўсебеларускія курсы для батракоў і пастухоў на 60 чалавек.

Капітальнае будаўніцтва ў шкляной прамысловасьці.

Зацьверджан плян капітальнага будаўніцтва ў шкляной прамысловасьці. Згодна гэтага пляну, у бягучым апэрацыйным годзе на капітальнае будаўніцтва ў шкляной прамысловасьці будзе адпушчана 426.000 руб.

Завоз хлебапрадуктаў у студзені.

У студзені Белкаапсаюз мяркуе завезьці 500 вагонаў жыта і жытняй мукі, 250 вагонаў пшанічнай мукі, 50 вагонаў розных круп і 150 вагонаў аўса і вотрубей. У сьнежні плян завозу хлебапрадуктаў выкананы на жыту і жытняй муцэ на 70 проц., на пшанічнай муцэ—на 73 проц., па крупах—на 30 проц. і па аўсу і вотрубях усяго толькі на 9 проц.

Забясьпечаньне беларускага рынку машынамі.

Машыны сыдыкат мае завезьці ў БССР розных машын і інструмантаў на 120.000 руб. Гэтыя тавары будуць завезены ў працягу студзеня.

На 200 тысяч руб. абутку.

Менскае акруговае кіраўніцтва працакалектывамі заключыла дагавор з Менскім Цэрабкопам на здачу яму ўсёй прадукцыі абуткового прадпрыемства № 2 на суму каля 200.000 руб.

Мэханізацыя шчотачнай фабрыкі.

На днях з Нямеччыны праз Управу Дзяржмаёмасьці БССР будзе атрымана абсталяваньне для мэханізацыі менскай шчотачнай фабрыкі, у якой зараз працуе 600 рабочых. Гэта дасьць магчымасьць павялічыць колькасьць прадукцыі і палепшыць якасьць яе.

Фізкультура.

Дыскусія аб боксу.

Зараз на ўсім СССР сярод фізкультурнікаў і, наогул, шырокіх рабочых мас стаіць пытаньне аб карысьнасьці і шкоднасьці боксу. Ёсьць шмат як прыхільнікаў, так і ворагаў гэтай галіны спорту.

У Маскве, Ленінградзе і іншых гарадох праводзіліся шырокія дыскусіі аб боксу з удзелам навуковых сіл.

Сярод кіраўнікоў ФК Менску ўжо гэтак-сама праводзілася сяброўская гутарка, як падрыхтоўка да шырокай дыскусіі аб боксу, якая адбудзецца ў лютым.

Стралковы спорт у Бабруйску.

У Бабруйску праведзены спаборніцтвы па стралковым спорце ў саюзе харчавікоў.

Пераходны прыз (вінтоўка) атрымала ячэйка сьпіртаводачнага заводу. Індывідуальныя прызы (срэбны гадзіньнік і компас) атрымалі т. т. Гразоўскі (завод „Аддзярыха") і Казакоў.

Розное.

«МЭХАНІЧНАЕ ВУХА» СУПРОЦЬ БУДУЧАГА ВОРАГА.

Анґельскія інжэнэры працуюць над вынаходкай такога апарату, які дазволіў-бы загадзя выявіць набліжэньне да Англіі паветранага або марскога флёту на гуках ад іхных матораў. Яны ўжо дасягнулі значных посьпехаў у гэтай справе. Напрыклад, пры вопытах у горадзе Бірмінгаме такое „механічнае вуха" зловіла гарматны выстрал, які зроблен быў больш як за 200 кілёмэтраў ад апарату.

ПАЛЁГКІ МНОГАСЯМЕЙНЫМ.

За апошнія гады лік нараджэньняў у Італіі ўсё больш і больш зьмяншаецца. У зьвязку з гэтым, італьянскі ўрад пастанавіў увесьці прэмії і вызваліць ад падатку сем'і з вялікай колькасьцю дзяцей.

НА БОЧЦЫ ПА АКІЯНУ.

Ня так даўно ў Індыйскім акіяне патануў турэцкі параход. Усе пасажыры параходу загінулі. Толькі капітан судна разам са сваімі 4-ма сынамі выратаваўся на бочцы, якую насілі хвалі два тыдні. Шчасьліўцаў падабрала італьянскае судно.

САВЕЦКІЯ РЭНТГЭНАЎСКІЯ АПАРАТЫ.

Да гэтага часу рэнтгэнаўскіх апаратаў у СССР не рабілі: іх прывозілі да нас з-заграніцы. Зараз у Ленінградзе на заводзе „Буревестник" упершыню ў СССР распачаўся выраб гэтых апаратаў, якія, як вядома, маюць аграмаднае значэньне ў мэдычнай справе.

ТУНЭЛЬ ПАД ЦІХІМ АКІЯНАМ.

Японскія інжэнэры будуюць гіганцкі падводны тунэль у 15 кілёмэтраў даўжыні. Гэты тунэль зьвяжа дзьве выспы ў Ціхім акіяне.

АЎТАМАБІЛЬНАЯ ДАРОГА НА СТРЭХАХ.

У Італьянскім горадзе Турыне на вышыні 60 мэтраў над зямлёй на стрэхах дамоў зроблена бегавая дарожка для выпрабаваньня гоначных аўтамабіляў.

ПОБАЧ З НЯЧУВАНЫМІ ДАСЯГНЕНЬНЯМІ—АДСТАЛАСЬЦЬ.

У Амэрыцы, у аэрузе Пэнсыльванія, да гэтага часу ёсьць чыгунка, на станцыях якой вывешана абвестка: „Паязды ходзяць толькі ў дажджлівыя дні". Такая дзіўная зьява тлумачыцца тым, што чыгунка праходзіць праз густы лес, які ня раз загараўся ад іскраў з цягніка. Чамусьці амэрыканцы ня хочуць замяніць паравозы цепловозамі.

СУД.

ЗА НЯДБАЙНАСЬЦЬ У ВЫКАНАНЬНІ АБАВЯЗКАЎ.

Грамадзянін вёскі Баравое, Койданаўскага раёну, Уладзімер Казёл быў абраны ўпаўнаважаным на ахове лясоў мясцовага значэньня.

Ідучы з агульнага сходу, Казёл гаварыў: „Траба паслужыць вобчаству; буду сумленна выконваць свае абавязкі; буду ахоўваць лес, бо ён у нашых умовах складае вялікую каштоўнасьць".

Але ня так здарылася, як абяцаў Казёл. З першых-жа дзён ён забыўся, што нясе адказную грамадзкую службу.

У Меншчыне ма' быць і ня знойдзецца такога добрага сябра лясоў, якім аказаўся Казёл.

Дабрата яго складалася з таго, што калі яму казалі, што ў лесе шмат парубкі, то ён накруціць галавой, пачэша патылічку і бяз усякага хвалявань адкажа:

— На тое і лес, каб яго сячы, не ў капусьце-ж яго варыць.

Калі ў лесе зрабіліся надта вялікія высечаныя паляны, некаторыя сяляне зварачаліся да Казла і пыталіся:

— А скажы, Уладзімер, ці з гэтага дрэнага нічога ня выйдзе?

— Што тут можа быць дрэнага? Што возьмеш—будзе тваё. Ня будзе лесу—ня будзе і клопату.

Сячы лес ехалі ўсе—каму трэба і каму ня трэба, а калі часамі Казёл сустракаў сялян з насечаным лесам, дык толькі пытаўся:

— Ну, як, Сымон, лес ятчэ ёсьць?

— Абы здароўя, братка, лесу хопіць.

Гэтак жартаваў з лесам Казёл, пакуль ад салодкага сну прачнуўся мясцовы РВК, але 570 лепшых дрэў, на суму 1202 руб., былі вырублены. Казла за такую службу прыцягнулі да адказнасьці, але і ка судзе вінаватым ён сябе ня прызнаў і паказаў наступнае:

— Лесу не пільнаваў, бо ня было часу, а пратаколаў на парубшчыкаў не складаў, бо ня было паперы, а да таго-ж я нянісьменны.

Менскі акруговы суд прыгаварыў Уладзімера Казла на 1 год і 4 месяцы зьнявольненьня, скараціўшы гэту кару на палову па амністыі.

Д. Кастроў.

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

«Лесараспраўцоўшчыкі».

Грамадз. Андрэй Верашчака, будучы памоцнікам кіраўніка савхозу Сьмілавічы, кіраваў загатоўкай дроў; у выніку гэтага „кіраваньня" у яго не хапіла 103 саж. дроў. Іван Бакуновіч дапамагаў Верашчаку выпісваць дровы на падложных квітках і рабіў расьпіскі ў атрыманьні ад Верашчакі грошай, якіх у сапраўднасьці не атрымліваў.

Менскі акруговы суд прыгаварыў Андрэя Верашчаку на год і тры месяцы зьнявольненьня, а Івана Бакуновіча на год. На аснове амністыі кара Верашчаку скарочана напалову, а Бакуновіч ад кары вызвален.

Няўдалая прадрыхтоўка.

У старшыні Запольскага с.-с., Плешчаніцкага р., Лявона Анкуды нарадзіўся сын. Гэту ўрачыстасьць Анкуда рашыў належна адсьвяткаваць, дзеля чаго выгнаў цэлыя бочкі самагону. Але плян Анкуды ня ўдаўся: супрацоўнікі пагранічнай варты зрабілі ў яго вобыск і арыштавалі самагон і самога старшыню.

Выязная сэсія Менскага акр. суду ў г. Барысаве прыгаварыла Лявона Анкуду на год зьнявольненьня з адхіленьнем ад пасады, але на аснове амністыі ад кары аслабаніла.

ЗДАРЭНЬНІ.

ЗАТРЫМАНЬНЕ ХУЛІГАНАЎ.

8 студзеня ў 7 гадзін вечара ў урочышчы „Тры Карчмы" (Менск) вядомыя хуліганы—Анісевіч, Жыдовіч і Меліч напалі на гр-н Гурмана, Сідара і Зайцмана і моцна зьбілі апошніх. Крым. Вышук затрымаў хулігана ў і прыцягнуў іх да адказнасьці.

ВЫКРЫТЫ ПАКРАЖЫ.

Крым. Вышук раскрыў кражу розных хатніх рэчаў, зробленую на Гандзёвай вуліцы № 12 у гр-ні Дымэнштэйн і на Біржавым завулку ў гр-на Капялевіча. Рэчы пры зладзеях знойдзены.

Апавяшчэньні.

ЧАРГОВАЯ ЛЕКЦЫЯ Ў НЯДЗЕЛЬНЫМ КАМВУЗЕ.

У надзелю, 15 студзеня, у 11 гадзін раніцы ў малой залі клюбу К. Маркса

адбудзецца ЧАРГОВАЯ ЛЕКЦЫЯ

у Надзельным Камвузе на тэму: «ИДЕАЛИЗМ и МАТЕРИАЛИЗМ». Лектар пр. ВЫДРА.

ЛІТАРАТУРА ДА ЛЕКЦЫІ:

ЭНГЕЛЬС—«Людвиг Фейербах, гл. 2, прим. Плеханова № 7».
Тэзісы Маркса аб Фэйербаху.
ЛЕНІН—„Материализм и эмпириокритицизм", гл. „Вместо введения", т. X.
ЛЕНІН—„Карл Маркс".
Л. ФЭЙЕРБАХ—Творы, т. І. Папярэднія тэзісы да рэформы філёзофіі. Тэзісы—1, 13, 16, 20, 34, 35, 36, 39, 40, 41 і 63.
ПЛЕХАНАЎ—„Предисловие к Деборину—Введение в философию диалектического материализма".

Максымум:

ДЭБОРЫН—„Введение в философию диалектического материализма—гл. о Берклии, Юме и Канте".
Архіў Маркса і Энгельса, кн. І—„Аб нямецкім ідэалізьме".

АПА Менакругкому КПБ.
Праўленьне Нядзельнага Камвузу.

У суботу, 14 студзеня, а 7-й гадз. вечара ў нэйтральным габінэце агітпропработы адбудзецца канфэрэнцыя членаў гурткоў індывідуалаў самаадукацыі, якія займаюцца па палітэканоміі.

Яўка ўсіх абавязкова.

Бюро самаадукацыі АК.

ПАПРАЎКА.

У № 10 (2198) нашай газэты за 12 студзеня г. г. у «ПАСТАНОВЕ № 2 НАР. КАМ. ГАНДЛЮ БССР» узралася памылка, а іменна, зьверху пастановы прапушчаны словы: «УЗГОДНЕНА З НАРОДНЫМ КАМІСАРЫЯТАМ УНУТРАНЫХ СПРАЎ».

ЗАКОНЫ і ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Савету Народных Камісараў БССР

аб зьняцьці з т. т. Шалаховіча, Я. А., Райскага, С. М., Грыгор'ева, А. А., і Эпштэйна, Б. П., абавязкаў членаў Вышэйшага Савету Народнае Гаспадаркі БССР і аб назначэньні т. т. Кононава, Г. Т., Руманава, А. Ф., і Погостскага, І. А., членамі Вышэйшага Савету Народнае Гаспадаркі БССР.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Зьняць з т.т. Шалаховіча, Якіма Абрамовіча, Райскага, Самуіла Мендалевіча, Грыгор'ева, Аляксандра Апанасавіча, і Эпштэйна, Бэнцыяна Пейсаховіча, абавязкі членаў Вышэйшага Савету Народнае Гаспадаркі БССР.

2. Назначыць т. т. Кононава, Гаўрылу Тодаравіча, Руманава, Алтара Файвішавіча, і Погостскага, Ісака Аронавіча, членамі Вышэйшага Савету Народнае Гаспадаркі БССР.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР **М. Мароз.**

31 сьнежня 1927 году.
г. Менск.

ПАСТАНОВА

Савету Народных Камісараў БССР

аб назначэньні тав. Розіна, А. Р., членам Прэзыдыуму Вышэйшага Савету Народнае Гаспадаркі БССР.

Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе** назначыць т. Розіна, Абрама Рыгоравіча, членам Прэзыдыуму Вышэйшага Савету Народнай Гаспадаркі БССР.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **М. Мароз.**

31 сьнежня 1927 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Совета Народных Комиссаров БССР

об освобождении т. т. Шолоховича, А. А. Райского, С. М., Григорьева, А. А., и Эпштейна Б.П., от обязанностей членов Высшего Совета Народного Хозяйства БССР и о назначении т. т. Кононова, Г. Ф., Руманова. А. Ф., и Погостского, И. А., членами Высшего Совета Народного Хозяйства БССР.

Совет Народных Комиссаров БСС **постановляет:**

1. Освободить т. т. Шолоховича, Акима Абрамовича, Райского, Самуила Мендалевича, Григорьева, Александра Афанасьевича, и Эпштейна, Бенцияна Пейсаховича, от обязанностей членов Высшего Совета Народного Хозяйства БССР.

2. Назначить т. т. Кононова, Гавриила Федоровича, Руманова, Алтера Файвишевича, и Погостского, Исаака Ароновича, членами Высшего Совета Народного Хозяйства БССР.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР **Н. Голодед.**
Управляющий Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР **М. Мороз.**

31-го декабря 1927 г.
г. Минск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Совета Народных Комиссаров БССР

о назначении тов. Розина, А. Г., членом Президиума Высшего Совета Народного Хозяйства БССР.

Совет Народых Комиссаров БССР **постановляет:** назначить т. Розина, Абрама Григорьевича, членом Президиума Высшего Совета Народного Хозяйства БССР.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР **Н. Голодед.**
Управляющий Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР **М. Мороз.**

31-го декабря 1927 г.
г. Минск.

Адказны рэдактар **М. КУДЗЕЛЬКА.**

ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА НА 1928 ГОД

НА ВЯЛІКУЮ БЕЛАРУСКУЮ ЧАСОПІСЬ ЛІТАРАТУРЫ, ПАЛІТЫКІ, ЭКАНОМІКІ, ГІСТОРЫІ, КРЫТЫКІ

„ПОЛЫМЯ"

(СЁМЫ ГОД ВЫДАНЬНЯ)

пад рэдакцыяй: З. Жылуновіча (адказны рэдактар), М. Зарэцкага і Я. Ліманоўскага

У ЧАСОПІСІ ПРЫМАЮЦЬ УДЗЕЛ САМЫЯ ВЫДАТНЫЯ БЕЛАРУСКІЯ —) ЛІТАРАТУРНЫЯ І НАВУКОВЫЯ СІЛЫ. (—

ЧАСОПІСЬ „ПОЛЫМЯ" ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ПАЎТАРА МЕСЯЦЫ

(8 кніжак на год) разьмерам кожны нумар 12-14 друкаваных аркушаў.

З ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ 1928 Г. НАМЕЧАНА ДА ДРУКУ:

ПРОЗА: Я. Нёманскі—„На рубяжы сталецьця", раман; І. Бэхэра (chci i CH 3: As Lewisit) (Адзіная справядзівая вайна), раман, забаронены да друку ў Нямеччыне; Цішка Гартны—„Крыжавыя дарогі" (3-я частка рэману „Сокі палыны"); Тарас Гушчы—„У палескай глушы" (У глыбі Палесьсьа), 3-я частка, аповесьць; Я. Ліманоўскі—„Над абрывам", аповесьць; В. Каваль—„Палыч", аповесьць; М. Зарэцкі—„Заклятыя мох" аповесьць; А. Дудар—„Калі находні дагараюць"—апавяданьне. Апавяданьні: Гергарт Поль, Ю. Фучык, Ф. Вейскопф, Ванчура і іншых. ПАЭЗІЯ: Якуб Колас—„На шляхох волі", паэма; Т. Кляшторны—„Сусьветы", паэма; Андр. Александровіч—„Цені на сонцы", паэма; А. Дудар—„Кастрычнік", паэма. ВЕРШЫ: Янкі Купалы, І. Бэхэра, В. Маракова, М. Грамыкі, Гурло А., Гора., Кляшторнага, Моркаўкі А., Чарота і інш.

У 1928 годзе ў „Полымі" значна ўзмацняецца літаратурна-крытычны аддзэл, у якім прымуць удзел: праф. І. Замоцін, праф. М. Піотуховіч, А Барычэўскі, Ул. Дзяржынскі (Чаржынскі), Адольф Чэрны, Гергарт Поль, М. Байкоў, Тодар Глыбоцкі, А. Санкевіч і інш.

ГАДАВЫЯ І ПАЎГАДАВЫЯ ПАДПІСЧЫКІ „ПОЛЫМЯ" АТРЫМОЎВАЮЦЬ БЯСПЛАТНЫ ЛІТАРАТУРНЫ ДАДАТАК (гл. газ. «Сав. Бел.» № 295 за 1927 г. і „Зьвязда" ад 1 студзеня 1928 г.).

ПАДПІСНАЯ ЦАНА на «Полымя» з дадаткам: на год—10 р.; 6 м-цаў—5 р., 3—м-цы—2 руб. 50 кап.

Даецца разрочка: пры падпісцы 4 руб.—1 студзеня; 3 р. 50 кап.—1 лютага; 2 руб. 50 кап.—1 кастрычніка.

ЦАНА АДДЗЕЛЬНАГА НУМАРУ 1 р. 50 кап.

ПАДПІСЧЫКІ, ПРЫСЛАЎШЫЯ ПОЎНАСЬЦЮ ПЛАТУ ДА 15-га ЛЮТАГА г. г., атрымоўваюць дадатак з першым запатрабаваньнем.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: у рэдакцыі часопісі „Полымя" (Менск, Савецк., 63); у Цэнтр. кнігарні БДВ (Менск, рог вул. Ленінскай і Савецк.); ва ўсіх акруговых аддзяленьнях БДВ; ва ўсіх паштовых аддзяленьнях, у галоўнай канторы газэты „Зьвязда" (Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх), у канторы падпіскі на газэты «Правда» і «Известия» (Менск, Савецкая, 61), у канторы газэты Беларуская Вёска» (Менск, Савецкая, 63) і яе ўпаўнаважанымі і селькорамі ва ўсіх раёнах БССР.

ПАСТАНОВА № 5.

Народнага Камісарыяту Гандлю БССР

12 студзеня 1928 г. г. Менск.

У дадатак да свае пастановы ад 5-га кастрычніка 1927 году, на падставе п. п. «в», «м» 4 арт. і «г» 7 арт. Часовага Палажэньня аб Наркамунутргандлі БССР (З. З. БССР 1924 г. № 25-26, арт. 227), Народны Камісарыят Гандлю БССР **пастанаўляе:**

1. У мэтах забясьпячэньня дзяржаўнай броварнай і крахмальна-патачнай прамысловасьці бульбай, ва ўстаноўленых п. 1 пастановы за № 55 ад 5-X—27 г. 26 кілёмэтравых радыусах вакол заводаў, вязьбе загатовак бульбы і вываз за межы БССР прыватнымі загатоўцамі забараняецца.

УВАГА: Падвоз і адгрузка бульбы прыватнымі асобамі з чыгуначных станцый, якія адлягаюць да 5 кілёмэтраў ад канчатковай рысы ўстаноўленых 26 кілёмэтравых радыусаў, таксама забараняецца.

2. Прыватныя гандляры (загатоўцы), якія жадаюць весьці загатоўку бульбы на абшарах БССР, павінны зьвярнуцца да акруговых інспэктароў гандлю для адведзеньня ім райёнаў загатовак, у якіх адсутнічаюць броварныя і крахмальна-патачныя заводы.

УВАГА 1. Акруговыя інспэктары гандлю адводзяць для прыватных гандляроў тыя райёны, у якіх не вядзецца загатоўка бульбы дзяржаўнымі і каапэрацыйнымі арганізацыямі для прамысловасьці.

УВАГА 2. Акруговыя інспэктары гандлю адводзяць райёны загатовак толькі ў тым выпадку, калі прыватныя загатоўцы даюць абавязацельства весьці загатоўкі бульбу па існуючых загатоўчых цэнах.

3. Да поўнага забясьпячэньня дзяржаўнай прамысловасьці бульбай катэгарычна забараняецца вываз усялякай бульбы з БССР дзяржаўнымі і каапэрацыйнымі арганізацыямі.

4. Нагляд за выкананьнем гэтае пастановы ўскладаецца на акруговых інспэктароў гандлю і міліцыю.

5. Вінаватыя ў парушэньні гэтае пастановы прыцягваюцца да адказнасьці: службовыя асобы паводле арт. арт. 106 і 141, а прыватныя асобы паводле арт. 141 Крымінальнага Кодэксу.

6. Гэтая пастанова ўваходзіць у моц з моманту апублікаваньня.

Народны Камісар Гандлю БССР АДАМАЙЦІС.

Сэкратар Наркамгандлю БССР МАЗО.

КІНО-ТЭАТР.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.
НЯДЗЕЛЯ, 15-І-28 г. **„КАЛЯ ТЭРАСЫ"**, драма ў 4-х дзеях з часоў 1917 г.
ПАЧАТАК А 8 З ПАЛОВ. ГАДЗ.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА» — Першы бытавы баявік **„ВОДОВОРОТ"**. ЗВЫШ ПРАГРАМЫ ХРОНІКА СОВКІНО № 108.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". — ГРАНДЫЁЗНЫ АМЭРЫКАНСКІ БАЯВІК **„ВЕЧНАЯ БОРЬБА"**. Мастацкая драма ў 7-мі частках. ШТОДНЯ—4 СЭАНСЫ. АНОНС! ХУТКА **„ВАР'ЕТЭ"**.

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». — **„СПАРТАК"** ШТОДНЯ 4